Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся! ... kich krajów, łączcie się! ... рии всех стран, соединяйтесь

САВЕТСКАЯ БЕЛАРУСЬ

15-ты ГОД КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ

ОРГАН ЦВК і СНК БССР
XIII ГОД ВЫДАНЬНЯ
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА

НЯДЗЕЛЯ 5 ЧЭРВЕНЯ 1932 г.
№ 124 (3503)

Москва, Кремль, Правительств. библ-ка СССР и РСФСР. янв-тек

М. І. Калінін

Аб савецкім гандлі

СНК Саюзу ССР і ЦК УсеКП(б) прынятыя: 6 мая пастанова аб збожжазагатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю збожжам, а 10 мая—аб пляне жывёлазагатовак і аб мясным гандлі калгасаў, калгаснікаў і аднаасобных працоўных сялян. Гэтыя пастановы маюць выключнае значэньне для працоўнага сялянства і ў асаблівасьці для калгасьніка́ў.

Па-першае, значна скарочаны плян збожжазагатовак у параўнаньні з мінулым неўраджайным годам. Значыцца, выкананьне збожжазагатовак пры сярэднім ураджаі будзе куды больш лёгкай задачай, чым у мінулым годзе.

Па-другое, яшчэ да яравой сяўбы зроблена разьмеркаваньне пляну по вобласьцях. Гэта дало магчымасьць прынамсі ў абласным маштабе, павялічыць плян яравой сяўбы для большага ўласнага забясьпечаньня (клін азімых павялічаны). Таму ёсьць поўная ўпэўненасьць у значным павялічэньні абласных збожжавых рэсурсаў.

Па-трэцяе, па сканчэньні збожжага гатовак і ўтварэньні насенных фондаў калгасы і калгаснікі маюць права вольнага продажу збожжа як на базарах, так і ва ўласных калгасных крамах.

Гэтая пастанова ўраду арганічна вынікае, па-першае, з росту тавараў прамысловасьці, па-другое, з узбуйненьня (калектывізацыі) сельска-гаспадарчай вытворчасьці, палепшаньня с-г. прыладаў і ўжываньня трактараў, што дае падвышэньне выхаду таварнага зерня на вёсны, па-трэцяе, з таго факту, што з кожным годам павялічваецца колькасьць таварнага зерня, што атрымліваецца дзяржавай ад саўгасаў.

Пастанова аб мясазагатоўках ідзе па тэй-жа лініі палепшаньня гандлю паміж горадам і вёскай, разгортваньня таваразвароту паміж калгасамі і фабрыкамі, стварэньня поўнай магчымасьці вольнага продажу сваіх лішкаў як калгаснікамі, так і аднаасобнымі працоўнымі сялянамі. Для падштырхваньня гэткага таваразвароту ўрад напало ву скараціў плян мясазагатовак на тры кварталы, што засталіся.

У сучасны момант як перад працоўнымі сялянамі, так і асабліва перад мясцовымі органамі ўлады стаіць задача — упаўне асвоіць гэтыя рашэньні ўраду і ператварыць іх у жыцьцё. У пастанове проста гаворыцца: «Абавязаць мясцовыя органы ўлады аказваць у гэтым калгасам і калгаснікам поўную садзейнасьць». Само сабой зразумела, што ўрад, садзейнічаючы, дапамагаючы, падштырхваючы разьвіцьцё эканамічнай сувязі паміж горадам і вёскай шляхам вольнай куплі-продажу і ўнутрывясковага абмену, разам з тым, катэгарычна ўказвае на неабходнасьць выкараненьня з гэтага таваразвароту прыватнікаў і спэкулянтаў-перакупшчыкаў, якія захочуць скарыстаць у сваіх карысных інтарэсах такую магчымасьць.

Бязумоўна, гэтыя меры ўраду успрымуцца як калгаснікамі, так і аднаасобнікамі з працоўных сялян вельмі станоўча, і на іх базе пойдзе разьвіцьцё савецкага гандлю.

Ня ў тым толькі справа, што ўрад дазваляе пасьля выкананьня дзяржаўных заданьняў па збожжазагатоўках і мясазагатоўках вольны продаж лішкаў, бо яшчэ ў мінулым годзе партыя неаднаразова прымала рашэньні аб неабходнасьці разьвіцьця савецкага гандлю гароднінай і наогул прадметамі, якія не рэгулююцца дзяржавай. Асабліва гэтых рашэньняў ураду заключаецца ў тым, што абмяжоўваецца разьмер збожжазагатовак і мясазагатовак. Тым самым некаторая катэгорыя насельніцтва перойдзе на рыначнае забясьпечаньне. Значыцца базар зьяўляецца неабходным фактарам забясьпечаньня.

Лёзунг аб неабходнасьці разьвіцьця савецкага гандлю ўжо мае значную дынасьць. Яшчэ ў маі мінулага году, па ініцыятыве тав. СТАЛІНА, ЦК даў дырэктыву аб павялічэньні каапэрацыйных і дзяржаўных магазынаў. У адозьве СНК Саюзу ССР, ЦК УсеКП(б) і Цэнтрасаюзу проста гаворыцца, «што выцясьненьне прыватніка і прыватнага гандлю яшчэ не азначае зьнішчэньня ўсякага гандлю, што, наадварот, выцясьненьне прыватнага гандлю прадпалагае ўсямернае разьвіцьцё савецкага гандлю і разгортваньне сеткі каапэрацыйных і дзяржаўных гандлёвых арганізацый па ўсім СССР».

Кастрычніцкі пленум ЦК УсеКП(б) у мінулым годзе прыняў спэцыяльную пастанову аб разгортваньні савецкага гандлю, у якой гаворыцца: «нясупынны рост лёгкай прамысловасьці і ўзрастаючыя магчымасьці ў справе загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў забясьпечваюць больш шырокае разгортваньне савецкага гандлю і больш узмоцненае будаўніцтва новай сеткі магазынаў, чым гэта мае месца да сучасна га моманту...»

Галоўнай прычынай, якая перашкаджае разгортваньню савецкага гандлю, зьяўляецца неразуменьне і няўменьне значнай праслойкі работнікаў каапэрацыйна-гандлёвага апарату перайсьці з рэек мэханічнага разьмеркаваньня тавараў на рэйкі разгортваньня савецкага гандлю».

Нарэшце, у дырэктывах да складаньня другога пяцігадовага пляну XVII партканфэрэнцыя асобна ўказала: «толькі на аснове разгортваньня таваразвароту магчыма забясьпечыць далейшае хуткае палепшаньне снабжэньня рабочых і працоўных вёскі прамысловымі таварамі і прадуктамі сельскае гаспадаркі для чаго ў сваю чаргу неабходна ўсямернае пашырэньне сеткі магазынаў, крам і ўсёй гандлёвай сеткі з правядзеньнем неабходнай тэхнічнай яе рэканструкцыі. Толькі на гэтай аснове магчыма падрыхтаваць адмену нармаваньня водпуску тавараў і замяніць сыстэму цэнтралізаванага разьмеркаваньня разгорнутым савецкім гандлем».

Бязумоўна, усе гэтыя дырэктывы значна пасунулі савецкі гандаль наперад. Асабліва каштоўна тое, што магазыны ня толькі каапэрацыі, але і прамысловых аб'яднаньняў і трэстаў спусьціліся да раёнаў.

У галіне гандлю прадуктамі харчаваньня асноўная работа прыпадае на каапэрацыю. Не ўваходзячы ў разважаньні аб аб'ектыўных прычынах, гэта работа пакуль ня зусім здавальняючая. У каапэрацыі перавышаюць тэмпы дзяцьці голага разьмеркаваньня, у той час як савецкі гандаль уключае ў сябе і ўменьне загатаўляць апроч дзяржаўных нарадаў.

Апошнія пастановы ЦК і СНК рубам паставілі перад каапэрацыяй пытаньне аб гандлі, і перш за ўсё прадуктамі харчаваньня. База савецкага гандлю па шыраецца да яе натуральных граніц: на базар прыцягваюцца аднаасобнікі з працоўных сялян, калгаснікі і калгас, як вытворнікі прадуктаў харчаваньня. Калі на першых часох на 5-зары будзе пераважаць дробязны тавараварот, дзе прадавец перадае непасрэдна спажыўцу тавар, дык з умацаваньнем савецкага базару селянін павязе сьвініну, цэлага барана, калгас можа накіраваць некалькі вазоў адразу сэзонных прадуктаў, якія патрабуюць шпаркай рэалізацыі ці асабліва хаваньня, што не па сілах калгасу. Калі асноўны попыт індывідуальных пакупнікоў, абслугоўваемых базарам—рабочых і працоўных, будзе задаволены, хто зьявіцца пакупніком значных мас прадуктаў, якія засталіся? Яснa, што калі каапэрацыя ня будзе падрыхтавана, яны акажуцца ў руках спэкулянтаў. Хоча яна гэтага ці не, але савецкі базар будзе зьяўляцца экзаменам мясцовай каапэрацыі. Зьяўленьне на базары спэкулянтаў будзе азначаць слабасьць каапэрацыі.

Мне прадстаўляецца дваякая роля каапэрацыі на базары. Па-першае, яна павінна прыйсьці з тэхнічнай дапамогай да прадаўцоў. Напрыклад, паставіць стол і нават пры ім вопытнага чалавека, які мог-бы разрубіць мяса і яго разважыць. Па-другое, яна павінна быць воптавым пакупніком. Колгасу вельмі часта можа быць выгадней здаць тавар з некаторай скідкай каапэрацыі, чым везьці яго на рынак. Адным словам, каапэрацыя павінна зьявіцца зручным, такім і выгодным абодвым бакам, г. зн. пакупніку і прадаўцу, пасярэднікам. У гэтым сутнасьць савецкага гандлю, і перш за ўсё па гэтай лініі ідзе выкананьне каапэрацыйнымі работнікамі генэральнай лініі партыі. Ні ў якім выпадку каапэрацыя не павінна скупляць прадукты на рынку і павышаць цэны.

Між іншым, я чуў пытальныя рэплікі такога роду: а ці ня ёсьць гэта адступленьне ад генэральнай лініі партыі? Мне здаецца, што кожны, хто хоць ледзь-ледзь уважліва прачытае ня толькі пастановы ЦК і СНК, але і пастановы ЦВК і СНК аб парадку гандлю калгасаў, калгаснікаў і аднаасобных працоўных сялян, той зразумее, што ўсе гэтыя пастановы ідуць у разьвіцьцё пастаноў ЦК і XVII партыйнай канфэрэнцыі аб савецкім гандлі, падкрэсьліваю — САВЕЦКІМ гандлі. Але, зразумела, кожная справа, а тым больш базар, больш верна, базар ны гандаль, з месца абмену паміж працоўнымі гораду і вёскі прадуктамі сваёй працы можа ператварыцца ў сваю процілегласьць — у месца, дзе спэкулянты-перакупшчыкі і прыватнікі будуць нажывацца за кошт рабочых і сялян. Вось чаму ў пастановах асобна агаворана неабходнасьць змагацца са спэкуляцыяй і прыватнікамі.

У нас былі таксама выпадкі, калі паасобныя каапэратывы замест таго, каб ехаць на вёску і загатаўляць прадукты, займаліся скупкай прадуктаў, якія прывозіліся на калгасныя рынкі, узьнімаючы цэны.

Трэба зразумець мясцовым работнікам, што гэтыя меры па сваім унутра ным сэнсе нічога агульнага ня маюць з тым пэрыядам нэпу, калі дапускалася на вядомых умовах ажыўленьне прыватніка. Гэтая стадыя даўно пройдзена. На самай справе, выраб с.-г. машын узьняты на такую вышыню, калі можна абслужыць калектыўную буйную гаспадарку: дзяржава ўжо атрымлівае сотні мільёнаў пудоў таварнага зерня ад саўгасаў; ня менш 70 проц. пасеўнай плошчы знаходзіцца ў руках калгасаў. Усё гэта дае такія арганізуючыя сілы дзяржаўным органам, што партыя і савецкая ўлада могуць зьмяняць напрамак іх работы з мэтаю лепшага абслугоўваньня мас.

Практычная мэта пастаноў сёньня відаць кожнаму: узьняць вытворчую ак тыўнасьць калгаснікаў; пашырыць рынак сельскагаспадарчых прадуктаў, прыцягваючы на гэты рынак калгаснікаў і працоўнага селяніна, які не знаходзіцца ў калгасе; лепш забясьпечыць рабочых, асабліва фабрычна-заводзкіх пасёлкаў, больш зьвязаных з базарам. Але апроч гэтых непасрэдных мэтаў трэба не выпускаць з-пад увагі і выцяканочых адсюль вынікаў. У кожным рабочым пасёлку ёсьць каапэратыў. Што-ж ён (каапэратыў) як староньні глядзяч будзе бесстаронна назіраць, як яго члены купляюць на рынку прадукты харчаваньня? Тады каапэрацыя ня выканае сваіх абавязкаў перад рабочымі і служачымі. Каб быць на вышыні свайго становішча каапэрацыя павінна актыўна ўмяшацца ў гэты мясцовы таваразварот.

У моманты сэзону тых ці іншых сельскагаспадарчых прадуктаў рынак перапоўнены, але бываюць перарывы, ну хоць-бы зімой, калі ўжо цяжка да стаць гародніну. Хто для мясцовага насельніцтва будзе замяняць базар?

У сэзон часамі на рынку зьявяцца сотні вазоў з гуркамі, наўрад ці каапэрацыя ў гэты час зможа імі гандляваць, бы гэта і непатрэбна, гэта простая страта. Але ў моманты ТАННЫХ ЦЭН зьнімаць з рынку ЛІШНІЯ ГУРКІ і загатаўляць іх для зімы — гэта ўжо абавязак каапэрацыі. Мала таго, яна павінна ўвайсьці ў згоду з цэлым радам калгасаў аб дастаўцы імі ўзімку такіх прадуктаў як бульба, морква, капуста і г. д. Зразумела, цана павінна быць адпаведна павышана з вучотам хаваньня і дастаўкі.

Вось калі каапэрацыя справіцца з гэтай цяжкай і складанай задачай, якая патрабуе і веданьня справы і практычнай гібкасьці, значыцца, ёю будуць правільна зразумелы задачы, па стаўленыя гэтымі пастановамі партыі і ўраду. Трэба яшчэ напомніць, што апроч усіх сельскагаспадарчых прадуктаў са студзеня, пасьля выкананьня збожжазагатовак, паступае на вольны продаж хлеб — адзін з найбольш ма напольных і разам з тым неабходных прадуктаў. Ці-ж не абавязак каапэрацыі ў моманты вялікага прывозу ра біць запасы, каб у часе няхватак забясьпечыць насельніцтва хлебам? Калі прадумаць усю сукупнасьць новых умоў для каапэрацыі, дык ясна будзе, што ўрад ва ўпор перад ёй (каапэрацыяй) паставіў задачу сапраўды наву чыцца ня толькі разьмяркоўваць дзяржаўныя фонды, а іменна: арганізаваць сапраўды САВЕЦКІ гандаль. Хто ня бачыць гэтай мэты ў пастановах, той упускае іх соль.

Роля саветаў у разьвіцьці гандлю вялізарная. Нельга-ж ня думаць, што досыць аднаго распараджэньня, і ўсё пойдзе само па сабе. Перш за ўсё трэба стварыць у горадзе або рабочым мястэчку хоць-бы мала-мальскі спрыяючую абстаноўку, каб калгаснік меў магчымасьць паставіць пад ахову кажа, напіцца гарбаты, пры жаданьні схадзіць у кіно, чытальню, навесьці спраўку па аграноміі, юрыдычных пытаньнях і г. д. Усё гэта павінна быць у базарны дзень да паслуг прыяжджых сялян.

Дарогі, якія вядуць у горад, пара прывесьці ў здавальняючае становішча. Сама базарная плошча павінна быць зручнай, і па магчымасьці падводы разьмешчаны па роду прадаваемых тавараў. Адным словам, горад павінен прыцягваць сам-па-сабе калгасьніка і аднаасобніка з працоўных сялян.

Зразумела, усе гэтыя дробязі маюць значэньне другараднае. Але асабліва на што павінна быць зьвернута ўвага выканкомаў, дык гэта на разьвіцьцё вытворчасьці прадметаў шырокага спажываньня. Галоўная труднасьць — не тэхнічныя, або матар'яльныя перашкоды — вядома, яны ёсьць, — а стварыўшыяся ў мясцовых людзей уманастрой, быццам гэта работа ня мае вялікага значэньня. Вось, тут, мне здаецца, трэба зрабіць рашучы пералом і паставіць у якасьці адзнэй з важнейшых задач выканкомаў выкарыстаньне маючыхся ў наяўнасьці і адшуканьне новых рэсурсаў для павялічэньня вытворчасьці прадметаў шырокага спажываньня.

Ільготы, атрыманыя калгаснікамі і аднаасобнікамі з працоўных сялян, вельмі значныя, але яны будуць тым большыя, чым лепш будзе апрацоўвацца зямля, бо галоўным паказьнікам збожжазагатовак усё-ж зьяўляецца колькасьць засеяных гектараў. Сельскагаспадарчыя вытворцы ў нас знаходзяцца ў выключна спрыяючых умовах: вялізарны рост прамысловасьці, а з ёй і гарадзкога насельніцтва, прадуяляе вялізарнае патрабаваньні на сельска-гаспадарчыя прадукты. Які-б прадукт ня быў, колькі-б яго ні ўрадзілася, прамысловае насельніцтва усё закупіць, калі не на яду, дык на тэхнічныя патрэбы. Сама вытворчасьць абяцае добрыя вынікі, прымаючы пад увагу, што найбольш цяжкая, першапачатковая домка—пераход ад індывідуальнай гаспадаркі да калектыўнай у асноўным закончаецца. Першы звал зямлі зроблен. Барозны, межнікі, вузкія, дрэнна апрацаваныя і няўгноеныя поласы з палёў зьніклі. Зьмяншаецца засьмечанасьць палёў. І, нарэшце, сельска-гаспадарчая тэхніка—трактар з адпаведнымі прычэпнымі прыладамі, —усё гэта таксама нанова набытыя сродкі, абапіраючыся на якія было-б ня толькі неразумна, але, літаральна, перад народам злачынна ня ўзьняць на вельмі значную вышыню ўраджай. Нават самы слабы вучастак—арганізаваўшасьць калгасаў, і то значна ўзрасла. Цяпер, абапіраючыся на накоплены вопыт трэба ў што-б то ні стала дабіцца такіх рэзультатаў па вырабе сельска-гаспадарчых прадуктаў, якія-б адпавядалі сучаснай патрэбнасьці ў іх. Потым перад калгасам стаіць задача ня толькі вазіць тавар на базар, але і пры магчымасьці да таго будаваць свае крамы, ларкі.

У заключэньне павінен сказаць наступнае: само па сабе зразумела, што ўся гэта складаная работа, распыленая па розных ведамствах і вытворчых каналах, павінна дырэктыўна аб'яднацца і накіравацца ў адпаведнасьці з рашэньнямі ЦК УсеКП(б) і ўраду мясцовымі партыйнымі органамі. Парука перамогі заключаецца ў тым, каб мясцовыя арганізацыі сур'ёзна ўспрынялі, што даны вучастак соцыялістычнага будаўніцтва—вельмі сур'ёзны вучастак, з досыць складанымі формамі клясавай барацьбы.

Пра ўтварэньне пры СНК БССР штабу для кіраваньня і нагляду за ходам месячніку лесазагатовак і лесавывазкі

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Для кіраваньня і нагляду за ходам месячніку лесазагатовак і лесавывазкі, абвешчаных пастановай Эка намічнага Савету за 22 мая 1932 г. (газ. «Савецкая Беларусь» № 116, за 28-V-1932 г.), утварыць пры СНК БССР штаб у складзе т. т. Бэнэка (старшыня), Розіна (нам. старшыні), Баскіна, Шапіра, Міруца, Шыцько, Сосіна, Сьвярдловай і прадстаўнікоў ад ЦК ЛКСМБ і рэдакцый газэт: «Зьвязда», «Савецкая Беларусь» і «Рабочий».

2. Даручыць раённым выканаўчым камітэтам на працягу 5 дзён арганізаваць такія-ж штабы ў кожным раёне і сельскіх саветах.

НАМ. СТАРШЫНІ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР
А. КАЛНІН.

КІРАЎНІК СПРАЎ САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ І ЭКАНАМІЧНАГА САВЕТУ БССР
С. КАНДЫБОВІЧ.

№ 310.
4 чэрвеня 1932 г.
г. Менск.

МТС БССР МОГУЦЬ І ПАВІННЫ
ПОУНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН ПАСЕУНАІ

Пра ход выкананьня веснавой сяўбы

Пастанова Савету Народных Кам'сараў БССР

Выслухаўшы даклад Народнага Камісарыята Земляробства пра ход выкананьня веснавой сяўбы, Савет народных камісараў БССР адзначае, што пры зусім незадавальняючым ходзе сяўбы па рэспубліцы ганебна адстаюць:

а) паўднёвая зона—Уваравіцкі, Нараўлянскі, Чачэрскі, Веткаўскі, Рэчыцкі, Камарынскі, Лоеўскі раёны;

б) цэнтральная зона—Прапойскі, Бягомльскі, Чырвонапольскі, Талачынскі, Касьцюковіцкі, Смалявіцкі, Віцебскі, Гомельскі раёны;

в) паўночная зона—Сураскі і Бешанковіцкі раёны.

Гэта тлумачыцца тым, што няма сыстэматычнага апэрацыйнага кіраваньня, няма правільнай расстаноўкі людзей і скарыстаньня трактарнай і конскай цягавай сілы і не праводзіцца масава-палітычная работа;

г) пры незадавальняючым ходзе выкананьня сяўбы ўсіх культур асабліва мала ўвагі зьвяртаецца большасьцю раённых арганізацый на сяўбу асноўных культур: бульбы, лёну, канапель, сласных культур і кармавых карняплодаў.

Савет народных камісараў БССР лічыць неабходным асабліва адзначыць энэргічную работу Жыткавіцкай і Чырвонаслабодзкай партыйных і савецкіх арганізацый і Жыткавіцкай МТС, якія дзякуючы мабілізацыі актыўнасьці і самадзейнасьці рабочых, калгаснікаў і аднаасобнікаў, выканалі плян сяўбы ўсіх культур, і Мсьціслаўскай і Лёзьнянскай машына-трактарных станцый, якія выканалі плян сяўбы лёну.

Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Даручыць Народнаму камісару земляробства і Цэнтральнай конкурснай камісіі на працягу аднаго дня ўнесьці прапановы аб парадку і разьмерах прэміі Жыткавіцкаму і Чырвона слабодзкаму раёнам і Жыткавіцкай машына-трактарнай станцыі за выкананьне пляну сяўбы і Лёзьнянскай і Мсьціслаўскай машына-трактарным станцыям за выкананьне сяўбы лёну.

2. Абавязаць усе раённыя выканаўчыя камітэты, саўгастрэсты скончыць сяўбу ў бліжэйшыя дні, паставіўшы цэнтральнай задачай сяўбу тэхнічных культур (лён, канопля, бульба, кармавыя кораніплоды) і сіласныя культуры.

Даручыць народнаму камісару земляробства ўскласьці на адыага з членаў калегіі адказнасьць за штодзенны кантроль за ходам сяўбы ў саўгасах.

3. Абавязаць усе цэнтральныя і раённыя савецкія і грамадзкія арганізацыі забясьпечыць у бліжэйшыя дні такое кіраваньне веснавой пасеўнай кампаніяй, каб скончыць яе ў бліжэйшыя дні, бо толькі своячасовае выкананьне пляну сяўбы забясьпечыць і колькасьць і якасьць зьбіраемага ўраджаю.

4. У сувязі з тым, што ёсьць выпадкі скарыстаньня адпушчанага аўсу на пасеў на іншыя патрэбы, катэгарычна папярэдзіць усе раённыя арганізацыі аб неабходнасьці безадкладнага скарыстаньня ўсяго адпушчанага насеньня ў парадку насеннай пазычкі.

Нам. старшыні Савету народных камісараў БССР А. КАЛНІН.

Кіраўнік спраў Савету народных камісараў і эканамічнага савету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.

4 чэрвеня 1932 г.

Сакратару ЦК КП(б)Б тав. ГІКАЛА, Наркамзему БССР тав. РАЧЫЦКАМУ, рабочым і адміністрацыйна-тэхнічнаму пэрсаналу Кузьнецкбуду

Укараняючы сацыялістычныя мэты працы, калектыў саўгасу «СТРЭЛІЧАЎ» дамогся датэрміновага сканчэньня сяўбы.

15 мая па сяўбе ярыны і 23 мая па сяўбе бульбы плян выкананы на 100 проц. Засеяна 140 га вікі, 96 га аўса, 98 га канюшыны, 12 га сіласных, 10 га буракоў, 102 га бульбы і пасаджана 12 га саду.

Плян контрактацыі бульбы для броваряў выкананы на 105 проц. Арганізавана дапамога адстаючым у сяўбе саўгасам.

Распрацоўка і ажыцьцяўленьне па станоў ЦК і СНК аб загатоўках і разгортваньні калгаснага гандлю зьявілася магутным вагаром у барацьбе за посьпехі бальшавіцкай сяўбы.

Рабочы калектыў і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал саўгасу «СТРЭЛІЧАЎ» завяраюць партыю, урад і рабочы калектыў Кузьнецкбуду, што будуць змагацца з бальшавіцкай упартасьцю за выкананьне пляну таварнай прадукцыі.

Дырэктар саўгасу КУЧАРАВЫ.
Старшыня рабочкому СТРЭНГЕЛЬ.
Сакратар партячэйкі ТУРСКІ.
Райштаб КАРАСЬ.

1000 руб. прэміі калгасу „Камунар"

Калгас «КАМУНАР», Воўкавіцкага сельсавету, Чавускага раёну, ударнымі тэмпамі датэрмінова скончыў сяўбу, засеяўшы 400 га. З гэтага ліку 107 га засеяна лёну.

За бальшавіцкае правядзеньне веснавой сяўбы Цэнтральны штаб Усебеларускага конкурсу на лепшае і патэрміновае сканчэньне сяўбы ПРЭМІРУЕ КАЛГАС «КАМУНАР» 1000 руб. З гэтай сумы 750 руб. перадана праўленьню калгасу для прэміраваньня лепшых брыгад, брыгадзіраў і калгаснікаў-ударнікаў і 250 руб.—старшыні калгасу.

С.

ЧЫРВОНАЯ ДОШКА

Кандыдатам на чырвоную дошку заносім Жыткавіцкую МТС, якая на 31 мая выканала плян сяўбы

на 92,4 проц.

ЗЬНІМАЕМ З ЧОРНАЙ ДОШКІ

занесены на чорную дошку Бялыніцкі раён, які паводле апошніх зьвестак на 30-га мая выканаў плян сяўбы на 60 процантаў.

ХОД СЯЎБЫ ПА МТС БССР

на 31-га мая 1932 г.

Назва МТС	Засеялі проц. пляну
Лёнамалочныя:	
Асьвейская	36,6
Бешанковіцкая	11,1
Бялыніцкая	25,0
Боркавіцкая	50,6
Ветрынская	59,9
Горацкая	53,5
Гарадоцкая	15,1
Дрысенская	16,8
Дубровенская	46,4
Лёзьненская	55,5
Лепельская	23,5
Мсьціслаўская	78,3
Полацкая	37,9
Расонская	30,2
Сіроцінская	14,6
Сураская	37,8
Сененская	39,9
Талочынская	31,1
Вушацкая	34,1
Чавуская	52
Чашніцкая	48,6
Шклоўская	41
Разам	43,3
Бульбянажывёлагадоўчыя	
Бягомльская	33,1
Будакашалёўская	46,3
Вузьдзенская	63,8
Жлобінская	45,6
Заслаўская	49,5
Касьцюковіцкая	27,1
Клімавіцкая	68,1
Койданаўская	40,4
Лагойская	52
Плешчаніцкая	45,6
Копыльская	52
Пухавіцкая	56,4
Рагачэўская	35,6

Назва МТС	Засеялі проц. пляну
Слуцкая	60,0
Смалявіцкая	25,6
Старадароская	35,0
Танежыцкая	37,7
Цялужская	55,5
Церахаўская	75,1
Путчынская	11
Бальшавіцкая	43
Разам	45,6
Жывёлагад.-канопл.	
Даманавіцкая	49,0
Жыткавіцкая	92,4
Лельчыцкая	37,6
Старобінская	70,4
Тураўская	76,1
Разам	65,9
Садова-гароднія	
Аршанская	48,6
Барысаўская	19,6
Віцебская	29,8
Гомельская	43,0
Менская	45,6
Магілеўская	40,1
Рэчыцкая	41,3
Разам	39,0
Табачныя МТС:	
Хойніцкая	65,4
Разам па МТС БССР	48,5

ЧОРНАЯ ДОШКА

Ня гледзячы на папярэджаньні ЦК КП(б)Б ад 27 мая, рад МТС БССР паранейшаму недапушчальна зацягваюць веснавую сяўбу, ставячы яе пад вагрозу зрыву.

За ганебнае адставаньне ў разгортваньні сяўбы, пакідаем на чорнай дошцы наступныя МТС:

Талачынскую, Бешанковіцкую, Путчынскую, Гарадокскую, Бялыніцкую, Віцебскую, Сіроцінскую і Асьвейскую.

Дадаткова заносім на чорную дошку:

Дрысенскую МТС, якая на 31 мая выканала плян сяўбы на 16,8 проц., Барысаўскую—19,6 проц., Лепельскую—23,5 проц., Касьцюковіцкую—27,1 проц., Смалявіцкую—25,6 проц.

Партарганізацыі і кіраўніцтвы гэтых МТС павінны зараз-жа дабіцца пералому ў разгортваньні веснавой сяўбы

Аб становішчы разгортваньня калгаснага гандлю

Пастанова ЦК КП(б)Б

ЦК адзначае зусім незадавальняючую работу Калгасцэнтру і яго сыстэмы па разгортваньні калгаснага гандлю і, што з боку партыйных, савецкіх, прафсаюзных і каапэрацыйных арганізацый ня было зьвернута належнай сур'ёзнай увагі на гэтае важнейшае пытаньне.

Улічваючы асаблівую важнасьць апошніх рашэньняў ЦК УсеКП(б) і ўраду Саюзу аб хлеба-мясазагатоўках і гандлю калгасаў, калгаснікаў і аднаасобнікаў працоўных сялян, якія маюць выключна важнае гаспадарча-палітычнае значэньне ў справе разгортваньня таваразвароту, мабілізацыі дадатковых рэсурсаў для палепшаньня снабжэньня працоўных і арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, ЦК КП(б)Б—пастанаўляе:

1. Абавязаць Гаркомы і Райкомы КП(б)Б, савецкія, прафсаюзныя, камсамольскія, каапэрацыйныя і калгасныя арганізацыі разгарнуць шырокую растлумачальную работу сярод рабочых, калгаснікаў і працоўных сялян аднаасобнікаў аб значэньні і практычным ажыцьцяўленьні вышэйпаказаных пастаноў партыі і ўраду з абавязковым давядзеньнем гэтых пастаноў да кожнага рабочага і калгасьніка. Увязаць прапрацоўку гэтых рашэньняў і ўсю масавую работу з задачамі пасьпяховага правядзеньня сяўбы, пашырэньня пасеваў зярнёвых, гароднины, вырошчваньня маладняка, разьвядзеньня трусоў і птушак, адкорму і нагулу жывёлы і максымальнага павялічэньня таварнага выхаду прадукцыі з тым, каб за гэты лік забясьпечыць стварэньне дадатковых фондаў для разьвіцьця гандлю калгаснікаў.

2. Абавязаць гарсаветы і РВК пад адказнасьць старшынь да 10-га чэрвеня прывесьці ў належны выгляд базары, зараз-жа разгарнуць на базарах будаўніцтва ларкоў, латкоў, з прыцягненьнем гандлёва-каапэрацыйных і калгасных арганізацый, максымальна разгортваючы іх ініцыятыву і шырока скарыстоўваючы мясцовыя будаўнічыя матар'ялы з тым, каб на працягу чэрвеня ўжо была пабудавана на асноўных базарах пралетарскіх цэнтраў патрэбная колькасьць ларкоў і латкоў.

Даручыць ЭКАСО ў дэкадны тэрмін вызначыць плян разгортваньня новых базараў, асабліва ў раёнах новастроек, і прамысловых цэнтраў, а таксама плян разгортваньня гандлёвай сеткі на базарах ў тым ліку і новых і дала жыць ЦК.

У пяцідзённы тэрмін ва ўсіх гарадох і раёнах вызначыць дні гандлю на базарах, выходзячы з таго, каб базары ўтвараліся не радзей 2-х раз у тыдзень. Аб днёх шырокага разгортваньня гандлю на базарах павінны быць добра паведамлены калгаснікі і бядняцка-серадняцкія масы. На ўсіх базарах вывесіць аб'явы, плякаты з вытрымкамі з рашэньня УсеЦВК і СНК СССР аб парадку ўтварэньня гандлю сельгаставарамі калгасамі, калгаснікамі і працоўнымі сялянамі аднаасобнікамі (аб гандлі па цэнах, якія складаюцца на рынку, аб вызваленьні гандлю ад падаткаў і збораў і г. д.). Гарсаветам забясьпечыць кіраўніцтва базарамі, асабліва ў дні шырокага гандлю, вылучаючы для гэтага адказных асоб.

3. Папярэдзіць ГК і РК КП(б)Б аб недапушчэньні якой бы то ні было спробы адміністрацыйнага рэгуляваньня цэн на базарах па продажы калга самі і калгаснікамі сваёй прадукцыі. Поўнасьцю ажыцьцявіць пастанову УсеЦВК і СНК, што гандаль калгасаў—калгаснікаў утвараць па цэнах, якія складаюцца на рынку, а гандаль калгасных аб'яднаньняў па цэнах ня вышэй сярэдня-камэрцыйных дзяржгандлю. Устанавіць строгі кантроль на базарах за поўным і тэрміновым правядзеньнем пастаноў УсеЦВК і СНК аб вызваленьні гандлю сельгаспрадукцыі калгасаў, калгаснікаў і працоўных сялян аднаасобнікаў ад рэспубліканскіх і мясцовых падаткаў і збораў і недапушчэньні перагібаў у справе спагнаньня разавых збораў для пакрыцьця выдаткаў па ўборцы базараў і ўтрыманьня іх ў чыстаце, строга прытрымліваючыся памераў, устаноўленых пастановай УсеЦВК і СНК Саюзу.

Асаблівую ўвагу ЦК зварочвае на неабходнасьць правядзеньня рашучай барацьбы са спэкуляцыяй і ўжываньня рашучых мер да выкараненьня прыватных гандляроў перакупшчыкаў.

4. Прапанаваць Белкаапсаюзу зараз-жа прыступіць да арганізацыі сеткі культурных чайных на базарах для абслугоўваньня калгаснікаў, працоўных сялян-аднаасобнікаў, якія прывозяць рэалізаваць на базарах сваю прадукцыю. Гарсаветам забясьпечыць для абслугоўваньня калгаснікаў у базарныя дні арганізацыю на буйных базарах у пралетарскіх цэнтрах даведачнага бюро, цырульень, мэдычных пунктаў, пастаялых двароў. У пяцідзённы тэрмін даць канкрэтныя заданьні адпаведным арганізацыям з указаньнем тэрмінаў іх выкананьня.

5. Улічваючы асаблівую важнасьць ня зьнае разгортваньня гандлю на базарах прамтаварамі, прапанаваць Белкаапсаюзу, Белгандлю і Белкаапрам саюзу шырока разгарнуць гандаль з боку сваіх сыстэм на базарах з ларкоў, латкоў, развозак прамтаварамі і прадметамі хатняга спажываньня сялян, забясьпечыўшы гандаль дастатковай калькасьцю тавараў. Белкаапсаюзу адначасова прыняць рад мер да палепшаньня забясьпечаньня прамтавараміі сельскай гандлёвай сеткі. Абавязаць вышэйпаказаныя арганізацыі ў пяцідзённы тэрмін прадставіць у ЭКАСО канкрэтны плян арганізацыі гандлю на базарах і палепшаньня снабжэньня прамтаварамі гандлёва-праводнай сеткі вёскі з тым каб канчаткова разгледзець гэтае пытаньне ў ЦК не пазьней 10-VI.

6. Прапанаваць Калгасцэнтру пад адказнасьць т. Міцькова зараз-жа даць канкрэтныя указаньні калгасам аб парадку арганізацыі імі гандлю. Сумесна з калгасамі і калгаснікамі зараз-жа разгарнуць і правесьці мера прыемствы па разгортваньні гандлёвай сеткі калгасаў з тым, каб да 1-VII было адчынена ня менш 40 калгасных магазынаў і 200 ларкоў. Калгасцэнтру у прыватнасьці даць указаньні калгасам аб бесьперашкодным прадстаўленьні коняй калгаснікам для вывазкі імі сваёй прадукцыі на базары.

Абавязаць гарсаветы аказаць канкрэтную дапамогу ў падшуканьні і прадстаўленьні памяшканьняў для калгасных магазынаў.

7. Калгасцэнтру на працягу двух дэкад правес

Непаваротлівасьць каапэрацыі

тармозіць разгортваньне калгаснага гандлю

Кінуць прамтавары на калгасны базар

Выправіць памылкі першага калгаснага базару

Раніцою ў нядзелю 29 мая з бліжэйшых сельсаветаў пацягнуліся ў Воршу рэдкія фурманкі на першы калгасны базар. Базарная плошча яшчэ змаль пустая. Ужо добра пачало прыпякаць сонца, а калгасьнікаў яшчэ мала, няма і калгасаў. Пачынаюцца хвалаваньні, — няўжо праведзеная растлумачальная работа ня дасьць ніякіх вынікаў. Няўжо лёзунгі прывітаньні застануцца восень як жывы паказьнік нежаданьня адгукнуцца на важнейшае мерапрыемства партыі і ўраду, а можа як дакор, няўменьне арганізаваць справу.

Пытаем пра цану.

— Колькі каштуе масла ?

— Восем.

Восем рублёў фунт? Такая-ж цана была і ўчора, і пазаўчора. Усё гэта доло магчымасьць не аднаму дзесятку ныцкаў працадзіць праз зубы, з пагардасьцю:

— Вось вам і калгасны базар.

Прыглядаемся да прадаўца масла. Роўныя, фунтавыя ў васковай паперы пакуначкі. Селянін, калгасьнік так не прадае. Зразумела, што гэта перакупшчык-спэкулянт. Іх на базары многа, калгасьнікаў мала і цэны таму высокія.

Але праз гадзіну — другую — хваляваньні і сумненьні пачынаюць расьсейвацца. Усё пусьцей і пусьцей раблася на плошчы. Пачалі прыяжджаць ня толькі асобныя калгасьнікі, але і калгасы. Ныцкі і перакупшчыкі— спэкулянты месца на базары не заста лося. Уцяклі.

Наўмысьля шукаў таго ныцка і спэкулянта. Дарма. І след прастыў. Там, дзе спэкулянт сядзеў з вялізным капцэлём, там цяпер калгасны воз умясь цўся.

Калгасы «Авангард», «Прамень са цыялізму», «Рабочая культура», «Чырвоны бераг» занялі пачэснае месца на базары. Яны прадавалі мяса, сьвініну, малако, яйкі, масла, турэц, крупы. Праўда, з меншай колькасьцю прадук таў былі прадстаўлены іншыя калгасы, бліжэйшыя да гораду сельсаветаў.

Цэны пачалі падаць.

— Пачом масла?

— Шэсьць.

Тут спэкулянту ня ўсядзець. Зьбяжыць. Прыехаўшыя калгасьнікі адразу заявілі, што яны спэкулянтам сабіраць цэны. І гэта ня гледзячы на тое, што ніхто цэн ніякіх не ўстанаўляў.

Базар. Тут цэны пачынаюцца ня бачанаму, ня выданаму закону. Пад'язджае калгас «Прамень сацыялізму». Пытаецца, як прадаваць.

— Мы многа браць ня хочам, але і задарма не аддамо.

Пагаварыўшы між сабой, пачынаюць прадаваць. Выходзіць, што прадаюць таньней, чым эраньня.

Жонка рабочага мэханічнага заводу прыходзіць да іх. Там вялікія бітоны малака.

— Колькі?

— Пяцьдзесят капеек літр.

— Па кніжкі паявых даюць?

— Бяз ніякіх кніжак. Бярыце колькі трэба.

Да поўдня ўся базарная плошча была застаўлена вазамі. Рады вазоў з ўзьнятымі ўгору аглоблямі цягнуліся далёка і па прылягаючых да базару вуліцах. Аршанскія старажылы кажуць:

— Даўно ў Воршы ня было такога вялікага базару.

На плошчы роўны, неўгамонны шум. Побач на возе пішчаць парасяты. Недзе крычаць куры, гукаюць колы прадаўца, які спазьніўся на базар. Усе гукі рэдкія, працяглыя, кароткія, зьліваюцца ў адзін роўнастай ны шум, і чамусьці пагляджэўшы з бо ку воддаль на сёньняшні базар здаецца, што гэта кірмаш асеньні, сьвяточны.

Сёньня толькі базар. Базар на новай аснове. Базар, які дае поўную магчымасьць распараджацца калгасу і калгасьніку прадуктамі свайго выра бу. Гэты базар дапамагае палепшаньню рабочага забясьпечаньня, дадае хаўчоў на рабочы стол. Сёньня толькі базар. А можна будзе арганізаваць савецкія і калгасныя кірмашы. Зараз калгас паслаў на базар 2—3-х членаў. А ўсе на полі — сеюць. А ўвосень мэ тазгодным было-б арганізаваць добрыя масавыя савецкія і калгасныя кірмашы. На базары і зараз шмат пра дуктаў. І цэны пачалі падаць. Бульба стала на 30 проц. таньней прадаваецца, масла на 35 проц., малако патанела больш чым на 100 проц., мяса на 40 проц.

Што калгасьнікі і калгасы прадаюць?

Вось паслухаем калгасьнікаў з «Рабочай культуры».

— Ёсьць у нас бычок, на племя гадавалі, добрага адкармілі быка, але ён нікога да сябе не падпускае, б'ецца, ніводнага ўжо на рогі браў. Што-ж рабіць — гадаваць далей разбойніка? Ад яго і карысьці ніякай ня будзе. Управы на яго няма. Прыдзецца зарэзаць. Трэба будзе на базар вывесьці. На наступны базар прывязем.

— Няма на яго ўправы — усе нібы апраўдваюцца калгасьнікі. Такія і падобныя выпадкі заўсёды могуць быць. Трэба толькі, каб арганізацыі на месцы не дапускалі разбазаваньня. Трэба, каб і ў гэтай справе была арганізаванасьць.

Цікава, тое, што калгасьнікі вельмі аднадушна ўзяліся за спэкулянтаў.

Гэта, вядома, не адразу робіцца, але пры арганізаванасьці можна зрабіць шмат чаго.

Каапэрацыя, Белгандаль наладзілі сустрэчы продаж тавару прамысловага вырабу. Трэба адразу сказаць, што падрыхтоўка была слабая і сустрэча была ня зусім удалая. Гандлю ючыя арганізацыі сустрэлі калгасьнікаў гатовай вопраткай, абуткам, мылам і іншымі таварамі. * * *

Але арганізаванасьці і парадку было мала. Лепей прадавалі ларкі і горш крамы. У вітрынах магазыну Белгандлю № 1 мыла, тарэлка, кава. У магазыне ёсьць і палітО, і гатовая вопратка, але кіраўнікі Аршанскага Белгандлю не дадумаліся вывесіць гэ тыя тавары на вітрыне, і калгасьнікі праходзяць міма такога магазыну.

У магазыне райкустпромсаюзу паліцы завалены коўдрамі, хусткамі. Тут як раз шмат калгасьніц. Коўдры і хусткі патрэбныя для іх рэчы. Але яны выходзяць з магазыну незадаволеныя і нават злосныя.

Бо... «расцепок нет», так заўляе цыльдачка на коўдрах, тое-ж гавораць і работнікі прылаўку.

Ёсьць магазын, у якім зусім ня ведаюць, што сёньня калгасны базар. Тут нават зьдзіўляюцца, чаму так многа сёньня людзей. Гэта магазын № 6 Белкопсаюзу. Да рэчы трэба сказаць, і пра магазын Плодгародкалгасцэнтру (пауклёмэтравае слова). На дзьвярах шыльдачка: «Піва, віно, квас».

— А ці ёсьць якая гародніна?

— Ёсьць буракі.

І гэтыя буракі там за дзьвярыма на кручку, аб іх ня ведае ніхто з пакупнікоў, яны захаваны ад іх вачэй. Работнікі магазыну не жадаюць займацца буракамі. Гэта работа чорная: вазьмер, а грошы мізэрныя. Лепей падаць віно з паліцы, завярнуць у паперку, прапанаваць дэлікатны пакупніку. Тут менш клапот.

А вось магазын № 4 ЦРК, і тут ня ма парадку. Там, дзе прадаюцца галёшы, гатовая вопратка, там няма прадаўца. І зноў такі няма ніякіх у магазыне адзнак, аб тым, што сёньня калгасны гандаль, аб тым, што каапэрацыя прадае сёньня для калгасьнікаў.

І ня гледзячы на тое, што ў магазыны была выкінута дастатковая колькасьць прадуктаў шырокага спажываньня, продаж іх ня быў наладжаны як сьлед. Ня было надпісу, лёзунгаў, тлумачэньняў, ня было паказаў тавараў у вітрынах, а гэта ўсё мае важнае значэньне. Такія адносіны гандлюючых арганізацый да продажу прамысловых тавараў зьніжаюць уражань не аб першым калгасным базары. Зра зумела, што бяз сустрэчнага, умелага і правільнага арганізаванага гандлю прамтаварамі будзе падрывацца калгасны гандаль.

Усё недахопы першага базару плян ны быць выпраўлены. Далейшыя базары трэба правесьці ўзорна, без спа дзяваньня на самацёк. Гандлюючым арганізацыям над гэтым трэба яшчэ многа папрацаваць. Ян Паўлоўскі.

У Бабруйшчыне недаацэньваюць калгасны гандаль

ЦК і СНК СССР і Савет Народных Камісараў БССР у сваіх пастановах па пытаньні разгортваньня гандлю калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобных працоўных сялян далі канкрэтныя ўказаньні.

Як-жа бабруйскія раённыя арганізацыі на справе ажыцьцяўляюць дырэктывы партыі і ўраду аб разгортваньні калгаснага гандлю? Праведзены ў апошнія дні рэйд па гэтым пытаньні паказаў, што ніводная з раённых арганізацый (райснаб, райкалгас саюз, каапэрацыйныя арганізацыі) гэ тым пытаньнем сур'ёзна не займаліся.

Паводле слоў райснабу тав. Рашкеса ўся работа выразілася ў тым, што пасьля выданьня пастановы аб калгас ным гандлі райкалгассаюзу было адведзена 3 крамы, якімі і па сёньняшні дзень ніхто не карыстаецца. На гэтым райснаб палічыў сваю місію скончанай.

Райкалгассаюз з свайго боку самым злачынным чынам ігнаруе дырэктывы партыі і ўраду аб разгортваньні калгаснага гандлю. Ён лічыць, што ўся справа залежыць ад райснабу і райзаў, а таму яму няма аб чым турбавацца. Таму ня дзіва, што тав. Альтшуль на пытаньне брыгады аб тым, як ідзе разгортваньне калгаснага гандлю заявіў: «спытайцеся ў Рашкеса, або ў Эрэнбурга».

Райкалгассаюз ня ўжыў ніякіх мер да таго, каб забясьпечыць выкананьне пастановы прэзыдыюму РВК аб вод пуску для калгасных сыстэмы прох магазынаў. На рынку ёсьць ларок Белкалгаспладгародніны, але працуе ён вельмі дрэнна, бо фактычна ніякай работы з калгасамі па забясьпечаньні яго таварамі не праведзена.

Прыгарадны калгас «Чырвоная Бярэзіна» ўжо на сёньня можа выкінуць на рынак значную колькасьць агародніны.

Зноў „аб'ектыўныя" прычыны

Характарным момантам зьяўляецца тое, што ўсе арганізацыі ўпіраюцца ў аб'ектыўную прычыну — «адсутнасьць памяшканьняў», а тымчасам большасьць гандлёвых памяшканьняў пустуе.

Да гэтага часу базар Бабруйску ня бачыў ніводнага арганізаванага выезду калгасаў і калгасьнікаў на рынак. Для калгаснага гандлю не адведзена нават месца. Пастановы ЦК і СНК аб калгасным гандлі не прапрацаваны ў большасьці калгасаў раёну.

„Як-бы ч го ня выйшла"

Нежаданьне па бальшавіцку рэалізаваць дырэктывы партыі і ўраду, бюракратычная коснасьць і непаваротлівасьці асобных раённых арганізацый зрываюць разгортваньне калгаснага гандлю. Кожная з ўстаноў чакае нейкіх пасобных дырэктыў па гэтым пытаньні, не жадае нічога рабіць баючыся «нарабіць памылак», баючыся «як-бы чаго ня выйшла».

Цэрабкоп і Белгандаль па лініі разгортваньня самазагатовак фактычна нічога не зрабілі. Яны ня маюць яшчэ ніводнага дагавору з калгасамі.

Побач з гэтым, каапэрацыйнымі арганізацыямі нічога ня зроблена ў галіне выходваньня на рынак прамтавараў з тым, каб калгасы прадаўшы свае прадукты маглі купіць сябе прамтавары.

Надзвычай слаба ідзе заключэньне дагавораў між прадпрыемствамі і калгасамі па рэалізацыі калгаснай прадукцыі. Да гэтага часу на прадпрыемствах Бабруйску няма ніводнага калгаснага ларка. Райпрафсавет у гэтай справе бязьдзейнічае.

Жорстка біць па апартуністах

Усе гэтыя факты яскрава характарызуюць апартуністычную бязьдзейнасьць асобных арганізацый у справе практычнай рэалізацыі дырэктыў партыі і ўраду аб разгортваньні калгаснага гандлю. Гэтая бязьдзейнасьць па вінна быць выкарчавана самым бязьлітасным чынам.

Ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі павінна канкрэтна выявіцца ў сапраўдным наладжаньні калгаснага гандлю, забясьпечаньні ўсіх умоў для пасьпяховага яго правядзеньня.

Апартуністы, якія сваёй бязьдзейнасьцю і няўменьнем кіраваць зрываюць правядзеньне калгаснага гандлю, тармозяць яго разгортваньне, па вінны быць прыцягнуты да самай суровай адказнасьці.

А. Дамброўскі.
Г. Рубенчык.

Прадпрыемствы Віцебшчыны ўзорна рыхтуюцца да Усебеларускага зьлёту

ВІЦЕБСК. (Ад наш. спэц. кар.). У сувязі з падрыхтоўкай да Ўсебеларускага зьлёту дэпутацкіх груп мэталяпрамысловасьці на 4 мэталяапрацоўчых заводах Віцебшчыны — «Чырвоны мэталіст», «Камінтэрн», акулярнай і іголкавай фабрык значна ажывілася работа дэпутацкіх груп.

Дэпутацкая група заводу «Чырвоны мэталіст» на Ўсебеларускім зьлёце падзеліцца сваім вопытам па барацьбе за тэхніка эканамічную незалежнасьць Савецкага саюзу, узорнай пастаноўкай грамадзкага харчаваньня і прыгарадняй гаспадаркі.

На заводзе ў часе абедзеных перапынкаў дэпутатамі праводзяцца гутаркі аб значэньні і мэтах Усебеларускага зьлёту, вяртаюцца лепшыя рабочыя - ударнікі ў савецкі актыў. У выніку, 7 рабочых рамонтнага цэху і 5 рабочых сьлясарнага цэху падалі заявы, у якіх выказваюць жаданьне прымаць актыўны ўдзел у рабоце гарадзкога савету і заводзкай дэпутацкай групы.

У сувязі з падрыхтоўкай да Ўсебеларускага зьлёту пленум дэпутацкай групы вылучыў тры брыгады ў дапамогу прыгарадняй гаспадарцы дзеля пабудовы трусатніка і сьвінарніка, а таксама па праверцы выкарыстаньня імпартнага абсталяваньня, адначасова праверыўшы, ці своячасова выконваюцца заказы для чорнай мэталюргіі.

Не адстае дэпутацкая група заводу «Камінтэрн», якая таксама ўзмоцнена рыхтуецца да зьлёту. У кожным цэху па зьменах праводзяцца гутаркі з рабочымі аб значэньні Усебеларускага зьлёту дэпутацкіх груп мэталяпрамысловасьці і задачах рабочых за воду ў справе своячасовага выкананьня заказаў для чорнай мэталюргіі.

Дэпутацкая група на чале са старшыняй — старым кваліфікаваным сьлесарам тав. Фрышманам вядзе барацьбу за эканомію мэталю і за своячасовае выкананьне заказаў па варштатах, якія раней прывозіліся з-за граніцы. На пленуме дэпутацкай групы абраны делегаты, якія наделяцца на Ўсебеларускім зьлёце вопытам сваёй работы. За сваю бліскучую работу ў справе барацьбы за прамфінпляц, за тэхніка - эканамічную незалежнасьць дэпутацкая група заслужыла вялізарнейшы аўтарытэт сярод рабочых заводу. Не дарма тав. Шульчынка — сакратар парт'ячэйкі, характарызуючы работу дэпутацкай групы гаворыць.

«наша дэпутацкая група зьяўляецца сапраўдным барацьбітом у справе выкананьне заводам прамфінпляну, своячасовага выкананьня адказьнейшых новапабудоў, за тэхніка - эканамічную незалежнасьць».

Ня гледзячы на тое, што за апошні час на акулярнай фабрыцы чатыры разы зьмяняўся старшыня дэпутацкай групы, што бязумоўна ў сваю чаргу дрэнна адбілася на рабоце апошняй, то ня менш за час абвяшчэньня Ўсебеларускага зьлёту дэпутацкіх груп мэталяпрамысловасьці, дэпутацкая група акулярнай фабрыкі значна разгарнула сваю работу, пабаявому рыхтуючыся да зьлёту.

Дэпутацкая група штодзённа і нястомна вядзе барацьбу з бракам, жорстка бічуючы бракаробаў. У гэтым кірунку яна дамаглася бліскучых вынікаў. Па ініцыятыве дэпутацкай групы быў абвешчан месячнік штурму па барацьбе з бракам, мабілізавана вакол гэтага пытаньня пралетарская грамадзкасьць фабрыкі.

У кожным цэху, агрэгаце, у клюбе, выстаўлены вітрыны браку і здымкі ві наватаў іх утварэньня. Зоркае вока аб'ектыву фабрычнай фота-газэты ня ўпускала ніводнага выпуску недобраякаснага фабрыкату.

Вось тыя, хто тармозяць выкананьне прамфінпляну фабрыкі. Ганьба бракаробам, якія па-драпежніцку псуюць каштоўны фабрыкат, павялічваючы сабекошт прадукцыі». Гнеўна клеймілі плякаты ў цэху, калі брамы клеймілі плякаты ў цэху, калі брамы фабрыкі і ў фабрычным клюбе, бракаробы і ў фабрычным клюбе, бракаробы, маральна ўзьдзейнічаючы на робаў, маральна ўзьдзейнічаючы на робаў, маральна тармозячы іх у выпрацоўцы утварэньня браку. У выпрацоўцы утварэньня браку. У выніку, рэзальна тачыльны цэх замест 1 проц. давёў брак да 1,17 проц. Ліцеўны цэх давёў выпуск браку да 2—3 проц. замест ранейшых 5—6 проц.

Брыгада Давыдавай з 1.000 адзінак браку зьнізіла выхад браку да 200. Аўтаматны цэх пачаў выпускаць добрую прадукцыю, падпягнуўся і зборрую прадукцыю, падрыхтоўчы цэх замест 3 ны цэх. Падрыхтоўчы цэх замест 3 браку да 0,32 проц. Значна зьнізіў выпуск браку і штампавальны цэх. Усяго па фабрыцы процант выхаду браку дасягае зараз 3,35 проц. замест ранейшых 10—12 проц. Дэпутацкая група на гэтым не супакоілася.

Пры непасрэднай дапамозе партыйнай і прафэсіянальнай арганізацыі фаорыкі замацоўваюцца дасягнутыя поспехі. Брыгада пераключылася на ўмацаваньне штампавальнага цэху, ад бесьперабойнай работы якога ў значнай ступені залежыць выкананьне прамфінпляну фабрыкі як па колькасных, так і па якасных паказьніках.

Дэпутацкая група, каб ліквідаваць прарывы, якія часта мелі месца ў рабоце штампавальнага цэху і якія ў сваю чаргу адмоўна адбіваліся на рабоце ўсёй фабрыкі, арганізавала скразную брыгаду, адну з іх гаспразьлікоўую, на чалё якой стаіць дэпутат ка тав. Барануўская.

Хто ня ведае на фабрыцы групорта дробна - падрыхтоўчага цэху — брыгадзіра скразной брыгады тав. Барануўскую?

Не, такіх рабочых няма на фабрыцы. Пры гутарцы з рабочымі работніцамі фабрыкі аб Барануўскай, апошнія ў адзін голас адзначаюць аб ёй, характарызуючы апошнюю як прыкладную работніцу, кроўна зацікаўленую ў рабоце сваёй фабрыкі.

Брыгадзірша скразной брыгады Каця Барануўская карыстаецца сярод рабочых выключным аўтарытэтам. Узорная работа, перавыкананьне сваіх заданьняў, эканомія дадатковых матар'ялаў зьніжэньне выпуску браку, замест плянавых 5,5 проц. да 0,3 проц. — вось што стварыў аўтарытэт брыгадзіршы Каці Барануўскай і яе скразной брыгадзе.

Рабочыя ўмеюць любіць і цаніць тых, хто сваёй самаадданасьцю паказвае бальшавіцкія ўзоры барацьбы за прамфінплян.

Па ініцыятыве дэпутацкай групы рад імпартных варштатаў, якія гадамі стаялі на фабрыцы без выкарыстаньня, зараз усе працуюць. Пушчаны ў ход двухфокусны варштат, які адрозьніваецца выключнай складанасьцю сваёй канструкцыі. Рабочыя цалкам апраўдалі работай гэтага варштату. Дэпутацкая група сумесна з тэхнічным пэрсаналам фабрыкі наладзіла тэхнічнае вучобу, дзе заняткоўца 260 чал., а таксама ўзяла шэфства над рабочымі, што працуюць на замежных варштатах і ў выніку аварыйнасьці абсталяваньня зьведзена да мінімуму.

Дэпутацкая група таксама прыймае актыўны ўдзел у рабоце бюро рацыяналізацыі, не даючы залежвацца каштоўнейшым рабочым прапановам. Ад сюль мы маем, што з 1 студзеня па 1 мая паступіла 182 рабочыя прапановы, якія даюць 102 тыс. руб. эканоміі ў год.

Дэпутацкая група акулярнай фабрыкі мае рад дасягненьняў у справе ахопу рабочых сацкультурнымі, індывідуальным страхаваньнем і рэалізацыяй пазыкі «3-га рашаючага». У сувязі з падрыхтоўкай да Ўсебеларускага зьлёту дэпутацкая група ўзяла на сябе абавязацельства датэрмінова выканаць фінплян II кварталу да 10 чэрвеня замест вызначанага тэрміну 15 чэрвеня.

Адным з адмоўных момантаў у рабоце дэпутацкай групы зьяўляецца на ступнае: ня гледзячы на тое, што акулярная фабрыка налічвае звыш 1.000 рабочых, апошняя да гэтага дня ня мае свайго адкормачнага пункту. Адкіды кухні забіраюцца прыватнікамі. Гэтаму пытаньню дэпутацкая група ўдзяляла мала ўвагі. Толькі ў апошні час у сувязі з падрыхтоўкай да зьлёту, дэпутацкая група рэзка паставіла пытаньне перад Белмэталяаб'яднаньнем і фабрычным арганізацыямі аб стварэньні пры фабрыцы адкормачнага пункту і трусатніка на 300 штук. Белмэталяаб'яднаньне пайшло на сустрач, адпусьціўшы 8.000 руб. на стварэньне адкормачнага пункту і набыць ця 200 штук трусоў.

Дэпутацкая група акулярнай фабрыкі на Ўсебеларускім зьлёце падзеліцца вопытам сваёй барацьбы за якасьць выпускаемай прадукцыі, выкананьня фінпляну і рацыянальнага выкарыстаньня імпартнага абсталяваньня.

Горш абстаіць справа на іголкавай фабрыцы. Толькі ў сувязі з падрыхтоўкай да Ўсебеларускага зьлёту 8 мая была абрана дэпутацкая група. Да гэтага-ж часу дэпутацкая група зусім не існавала з-за поўнай адсутнасьці дапамогі і кіраўніцтва з боку фабрычных арганізацый. Былая дэпутацкая група распалася, нават і зараз сакратар парт'ячэйкі яўна ігнаруе работу дэпутацкай групы. Многа патрэбна было працы, каб угаварыць цьвёрдалобага сакратара парт'ячэйкі аб недаходнасьці пасылкі делегатаў на Ўсебеларускі зьлёт і ўсё-ж такі замест трох дэпутататаў іголкавая фабрыка пасылае толькі двух. Сакратар ячэйкі гэта тлумачыць тым, што яма патрэбы пасылаць трох делегатаў, бо дэпутацкая група яшчэ сябе не праявіла, ня думаючы аб тым, што значная віна за слабасьць работы дэпутацкай групы падае ў першую чаргу на яго-ж, таму, што з боку парт'ячэйкі адсутнічала дапамога і кіраўніцтва.

Гэтай апартуністычнай недаацэнцы сакратаром ячэйкі значэньня і работы дэпутацкай групы на фабрыцы трэба пакласьці канец. Слова за Віцебскім Гаркомам партыі.

Нельга не адзначыць работу Віцебскага гарсавету і ў справе штодзённага апэрацыйнага кіраўніцтва дэпутацкімі групамі ў падрыхтоўцы іх да Ўсебеларускага зьлёту мэталяпрамысловасьці.

Віцебскі гарсавет сумесна з рэдакцыяй «Віцебскі пралетары» склікаў гарадзкую нараду дэпутацкіх груп мэталяапрацоўчых заводаў, якія ўжо ўдзельнічаць на зьлёце, абгаварваючы, па якіх пытаньнях кожная дэпутацкая група падзеліцца сваім вопытам. Быў выпрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы, з чым кожны завод — удзельнік Ўсебеларускага зьлёту—павінен прыйсьці на зьлёт.

Ня гледзячы на тое, што газэта «Віцебскі пралетары» адна з першых пачала весьці падрыхтоўку да зьлёту, прывёўшы прыклады актыўнай падрыхтоўкі дэпутацкіх груп заводу «Чырвоны мэталіст» і іншых, тым ня менш газэта не дае канкрэтную праграму задач работы дэпутацкіх груп, слаба выпукляючы абмен вопытам, не гаворачы таксама аб своячасовым выкананьні заказаў для чорнай мэталюргіі.

Газэта павінна зараз-жа перабудавацца на хаду з тым, каб штодзённа і апэрацыйна ў тыя дні, якія яшчэ засталіся, па-баявому разгарнуць паказ бальшавіцкай падрыхтоўкі да Ўсебеларускага зьлёту дэпутацкіх груп мэталяпрамысловасьці, які мае выключнае значэньне ў справе хутчэйшага вызваленьня савецкай краіны ад тэхніка-эканамічнай залежнасьці.

Межарыцкі.

Акулік

За бальшавіцкую падрыхтоўку да новага навучальнага году

Сёлетні навучальны год праходзіў пад знакам барацьбы за пабудову савецкай палітэхнічнай школы на аснове пістарычнай пастановы ЦК Усе КП(б) і ЦК КП(б)Б аб пачатковай і сярэдняй школе.

Асноўным недахопам школы зьяўляецца тое, што яна не давала дастатковага аб'ёму агульна-адукацыйных ведаў, што скончыўшы нашу сямігадовую школу пападаў у тэхнікум, ФЗУ, або іншую школу без сыстэматычных ведаў, а іншы раз проста няпісьменным. «Карэнны недахоп» школы перашкаджаў пасьпяховай падрыхтоўцы спэцыялістаў, якія павінны аўладаць навейшымі дасягненьнямі навукі, тэхнікі. Пры безумоўных дасягненьнях наша школа мела і іншыя «грахі», якія перашкаджалі правільнай перабудове педагагічнага працэсу на аснове злучэньня тэорыі з практыкай, на аснове падраджаньня грамадзка-вытворчай працы вучэбна-выхаваўчым мэтам школы. Да іх ліку адносяцца: комплексная сыстэма выкладаньня, якая перашкаджае сыстэматычнаму засваеньню ведаў, г. зн. «мэтад праектаў», які зьяўляўся лёгічным вывадам з антыленінскай тэорыі «адмаранья школы», па якім педагагічны працэс будаваўся на аснове падпарадкаваньня тэорыі грамадзкім задачам, дзякуючы чаму ад праграмы бралася ўрыўкі, кусткі, патрэбныя для таго ці іншага праекту. У радзе школ панавала славеснасьць, схалястычнасьць у выкладаньні.

Партыя моцна ўдарыла па ўсіх гэтых скажэньнях партыйнай лініі ў школьным будаўніцтве, паказала правільны шлях працы школы, указаўшы ўсім работнікам школы, органам НКА, гаспадарчым арганізацыям, профсаюзам, камсамолу іх месца і абавязкі ў пабудове палітэхнічнай школы.

Цэлы рад школ БССР у барацьбе за рэалізацыю пастановы ЦК правяў сваёй працы балышавіцкія тэмпы і цьвёрдасьць і дабіўся добрых вынікаў. Пра ходзячы зараз конкурс на лепшую на літэхнічную школу і лепшага настаўніка шырока выявіць дасягненьні нашых школ. Ён дасьць барацьбітам-матар'ял па вопыце жывой школьнай працы. Калі гэты вопыт сыстэматызаваць і шырока распаўсюдзіць, настаўнікі атрымаюць каштоўную для сябе дапамогу.

Адпак абсьледваньні школ (красавік) паказалі, што яшчэ няма рашучага пералому ў барацьбе за палітэхнічную школу Маркса-Леніна.

У школах яшчэ нізкая пасьпяховасьць. Палітэхнічнае навучаньне праводзіцца неадвагальніча. Вельмі мала школ, якія маюць працоўныя пакоі, майстэрні, апошнія слаба абсталяваны. Гаспадарчыя арганізацыі ў большасьці не аказалі належнай дапамогі школе палітэхнічным абсталяваньнем, сродкамі, арганізацыяй вытворчай працы вучняў на прадпрыемствах, значная частка настаўніцтва непадрыхтавана праводзіць палітэхнічна-вытворчае навучаньне ў працоўным пакоі, у майстэрні, на вытворчасьці. Тэарытычнае навучаньне ня ўвязваецца з вытворчай і грамадзкай працай вучняў. Ёсьць вы падкі скарыстаньня вучняў, як чыста рабочай сілы. Некаторыя школы па слабілі свой удзел у сацыялістычным будаўніцтве. У цэлым радзе школ зной дзена паслабленьне працы па камуністычным выхаваньні дзяцей. Асаблівае выразна выявілася зараз права-апартуністычная небясьпека—гэта ператварэньне школы ў чыста славесную, схалястычную. Маюць месца і «лявацкія» зьявы.

Зьвесткі з асобных раёнаў сьведчаць, што абвешчаны конкурс на лепшую палітэхнічную школу і лепшага настаўніка, узьняў новую хвалю энтузіязму сярод настаўніцтва, пэнэрэскіх арганізацый і ўчнёўскай масы. Узрушыліся і некаторыя гаспадарчыя арганізацыі. Раённы друк, слаўная армія рабселькораў узьняла барацьбу за рэалізацыю пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б) аб школе. У раёнах намецілася па некалькі школ на ўсебеларускі конкурс. Ідзе сацыяборніцтва паміж школамі, выяўляюцца героі працы—настаўнікі.

Зусім зразумела, што ўсю працу па заканчэньні навучальнага году мы праводзім пад знакам праверкі рэалізацыі пастановы ЦК партыі аб школе, пад знакам падрыхтоўкі да новага навучальнага году. Мы ставім асноўную задачу—устанавіць на кожнай школе, як школа ў цэлым, пасобныя настаўнікі, ручнёўскае самакіраваньне, пэнэрэская арганізацыя змагаліся за палітэхнічную школу, якія посьпехі дасягнуты за год працы. Мы ставім задачу выясьніць як школа мабілізавала шырокую пралетарскую і калгасную грамадзкасьць, як яна арганізавала вакол сябе культармію, мабілізавала грамадзкасьць сродкі і дапамогу школе. Важнейшай задачай зьяўляецца правяраць удзел фабрыкі, заводу, транспарту, калгасаў, МТС, і саўгасаў у будаўніцтве палітэхнічнай школы, іх дапамогу ў палітэхнічным абсталяваньні школьных майстэрняў, працоўных пакояў, устанавіць як прадпрыемства, калгас і саўгас дапамагалі арганізаваць палітэхнічную вытворчую працу вучняў, як інжынэрна-тэхнічныя працаўнікі, аграномы прымялі свой энтузіязм у справе рэалізацыі пастановы ЦК аб школе.

На фоне агульнай працы школы аба вязкова неабходна даць поўны малюнак працы пэрсанальна кожнага настаўніка, яго адносіны да працы, мэты ды працы, удзел у грамадзкай працы, у падвышэньні сваёй кваліфікацыі. Ацэнка працы вучнёўскага самакіраваньня, пэнэрэжатага і пэнэрэгрэгацыі ў цэлым увойдзе неабходным

— пераводзяцца з групы ў групу і выпускаюцца з 7-й групы толькі тыя вучні, якія засвоілі аб'ём ведаў згодна плянаў школы, пабудаваных на аснове новых праграм;

— у пачатковых школах робіцца ня выпуск, а пераводы ў 5-ю групу—гэта таму, што з новага навучальнага году ўводзіцца абавязковае ўсеагульнае навучаньне на базе сямігодкі па ўсёй БССР;

— вучань, які не пасьпявае больш чым па 2-х прадметах, пакідаецца на другі год, пакідаць вучня на 3-ці год нельга, неабходна яго накіраваць у сыстэму вечэрняга навучаньня;

— непасьпяваючаму па двух прадметах дасцца праца на лета, пры чым загадчык школы абавязкова арганізуе яму дапамогу, вучням першых трох груп ніякіх прац на лета не дасцца— яны або застаюцца на другі год, калі не пасьпяваюць, або пераводзяцца ў старэйшую групу. Вучні 7-й групы, якія не пасьпяваюць па 1-2 прадметах, выпушчаюцца з школы і ім даецца адпаведная справка і права на працу году трымаць іспыты.

Неабходна падкрэсьліць, што за ўсёй працы па пераводзе і выпуску вучняў вялікая адказнасьць кладзецца на настаўніка. Настаўнік адзяньне пасьпяховасьць дзяцей, настаўнік дае заключэньне аб магчымасьці пераводу ці выпуску. Таму, кожнаму настаўніку трэба з асаблівай сур'ёзнасьцю праводзіць гэтую працу. Мы зьядзем барацьбу з другагодніцтвам і самым лепшым мэтадам барацьбы будзе, калі мы ня пусьцім у наступную групу слаба пасьпяваючага вучня. Самы лепшы від барацьбы з другагодніцтвам—гэта дапамога адстаючым вучням, на працягу ўсяго году навучаньня і выхаваньня. Глыбокую памылку дапушчаюць і зьяўную шкоду робяць тыя настаўнікі, якія ў пагоні за процантамі пасьпяховасьці пераводзяць непасьпяваючых вучняў.

Рашаючым крытэрыем пры пераводзе, або выпуску зьяўляецца матар'ял па вучоце гадавой працы вучня, ніякія дадатковыя іспыты (экзамэны) не павінны мець месца.

Вынікі працы кожнай школы ў пасобку даюць магчымасьць падзесьці вынікі па ўсім раёне. Кожная школа назаўтра пасьля заканчэньня сваёй працы высылае рыніні ўпаўнаважаному АНА, які не пазьней 15-га чэрвеня павінен зьявіцца ў раён, дзе арганізуецца тэрміновая распрацоўка лічбовага ды іншага матар'ялу, з тым, каб ужо на Райканфэрэнцыі ў справаздачы АНА на падставе гэтых даданых была зроблена ацэнка працы школ па ўсім раёне.

Раённыя канфэрэнцыі праводзяцца пад знакам мабілізацыі настаўніцкіх мас на выкананьне задач на культурным будаўніцтве пастаўленых сакавіцкім пленумам ЦК КП(б)Б і ЦКК КП(б)Б, задачы па пасьпяховым выкананьні чацьвёртага заключнага году пяцігодкі.

Задачы райзьлётаў заключаюцца ў тым, каб ручнім даць сьпіс іх барацьбы за рэалізацыю пастановы партыі аб школе, зьвязаўшы гэтае пытаньне з 10 годзьдзем пэнэрэарганізацыі. На вучнёўскай арганізацыі ў гэтым навучальным годзе выпалі адказнейшыя задачы: барацьба за якасьць вучобы, за сьвядомую дысцыпліну, за рэжым школьніка, за дапамогу школе ў камуністычным выхаваньні дзяцей.

Падрэзьненьне вынікаў райзьлётаў дасьць багаты матар'ял, для наступнага году. Неабходна гэтыя вынікі старанна падвесьці, апісаць у друку лепшыя паказьнікі працы. Задача ГК і РК ЛКСМБ сумесна з АНА абслужыць райзьлёты.

Да адпачынку настаўнік ужо павінен цьвёрда ведаць дзе ён будзе працаваць. Важнейшай задачай органаў АНА і саюзу працасьветы зьяўляецца замацаваць настаўніка ў школе на будучы навучальны год, утварыць яму патрэбныя ўмовы для працы, змагацца за яго матар'яльны дабрабыт, за бераўлівыя адносіны да настаўніка.

Патрэбен уважлівы падыход АНА да патрэб настаўніка і задавальненьня яго просьбы аб пераводзе ў іншую школу, або нават ў іншы раён, калі гэта патрэбна. Але нельга дапусьціць гэтага як масавага зьявішча. У Касьцюковіцкім, раёне падалі заяву аб пераводзе ў іншыя раёны 150 настаўнікаў, часамі з зусім неабгрунтаванымі прычынамі, як напрыклад: «пусьцеце мяне ў Расонскі раён, бо я адтуль», або «а калі вы не пераводзеце мяне ў Менскі раён, я больш не хачу быць пэдагогам». Па такіх матывах трэба біць, трэба разам з гэтым растлумачыць настаўніцтву ўсю шкоднасьць такіх «матываў». У той-жа час неабходна задаволіць жаданьне тых настаўнікаў, якім неабходна пераехацься ў іншую школу, або ў іншы раён па сямейных прычынах, па стане здароўя. У гэтым пытаньні патрэбен больш чулы падыход да настаўніка, чым гэта назіралася з боку некаторых АНА.

Пытаньне ўкамплектаваньня школ настаўнікамі яшчэ да адпачынку зьязана з адной вельмі вялікай праблемай. Мы ўводзім усенаўчэньне на базе сямігодкі. Пэдінстытуты сваімі выпускамі не задавольваюць колькасный патрэбы настаўніцтву для II канцэнтру. У працэсе заканчэньня навучальнага году павінна быць праведзена вялікая праца па вылучэньні больш 2000 настаўнікаў ў друг

Пастанова Сакратарыяту ЦК КП(б)Б

аб становішчы марксысцка-ленінскага выхаваньня на прадпрыемствах гор. Барысава

I. Прызнаць, што работа па марксыцка-ленінскім выхаваньні партарганізацый вядучых прадпрыемстваў гор. Барысава — сарвана. Нездавальняюча працуючая ў асеньня-зімоўны перыяд сетка партасьветы (на Бярэзінскім камбінаце было ахоплена — 16 проц. канд. і 14 проц. маладых членаў КП(б)Б; на «Домбалі» — 21 проц кандыдатаў і 50 проц. маладых членаў КП(б)Б і г. д.), у сучасны момант не працуе. Райком КП(б)Б і парткомы прадпрыемстваў не забясьпечылі сыстэматычнага канкрэтна-апэрацыйнага кіраўніцтва гэтым адказьнейшым вучасткам работы, не арганізавалі партыйна-выхаваўчай работы з новымі папаўненьнямі партыі ня гледзячы на тое, што толькі за апошнія два кварталы (IV кв. 31 г. і I кв. 32 г. партарганізацыя вырасла на 328 чал. (129+199 ч) новых кандыдатаў КП(б)Б, не разгарнулі шырокай палітвыхаваўчай работы сярод рабочых прадпрыемстваў гор. Барысава — гэтым самым ня выканалі не адпаразовыя пастановы ЦК па гэтым пытаньні.

Адзначыць, што важнейшыя рашэньні партыі (рашэньні XVII партканфэрэнцыі і XIV зьезду КП(б)Б, пастановы сакавіцкага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б, у партарганізацыях прадпрыемстваў сярод рабочых апошніх праігнараваны слаба.

II. Сакратарыят ЦК КП(б)Б лічыць, што гэткае становішча па кіраўніцтве марксыцка-ленінскай прапагандай ставіць пад пагрозу выкананьне важнейшых дырэктыў партыі аб выхаваньні новых папаўненьняў партарганізацый і новых папаўненьняў рабочае клясы. Сакратарыят ЦК лічыць адносіны, якія наглядаюцца да кіраўніцтва партвыхаваўчай работай на прадпрыемствах з боку парткомаў, аддзелаў РК (Культпропаддзелу і рэд. «Бальшавік Барысаўшчыны») недапушчальнымі і разгледае іх, як недаацэнку марксыцка-ленінскага выхаваньня партарганізацый і рабочых калектываў.

III. Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1) За зрыў марксыцка-ленінскага выхаваньня партарганізацый і камсамолу на прадпрыемствах гор. Барысава, за няўважлівыя адносіны да палітасьветнай работы сярод беспартыйных рабочых гэтых прадпрыемстваў, Загадчыку Культпропам Барысаўскага РК КП(б)Б т. Лінгу, які не забясьпечыў рэалізацыю дырэктыў ЦК КП(б)Б па марксыцка-ленінскім выхаваньні — абвясьціць вымову і зьняць з работы. Папярэдзіць РК КП(б)Б і парткомы Бярэзінскага камбінату і Гаркамбінату аб недапушчальнасьці адносін, якія наглядаюцца да марксыцка-ленінскага выхаваньня камсамолу і палітасьветнай работы сярод беспартыйных рабочых.

2) Прапанаваць Райкому КП(б)Б, парткомам і ячэйкам КП(б)Б прадпрыемстваў у 2-х дзённы тэрмін алста навіць сетку партасьветы на прадпрыемствах, якая спыніла сваю работу, значна пашырыўшы яе з мэтай забясьпечаньня найбольш поўнага ахопу марксыцка-ленінскім выхаваньнем шырокіх мас партыйцаў, камсамольцаў і беспартыйных рабочых. Паставіць у цэнтры ўвагі работу з новымі папаўненьнямі і прапагандыстамі, усёй сыстэмай парткіраўніцтва забясьпечыць павышэньне якасьці марксыцка-ленінскай прапаганды і ідэалёгічную вытрыманасьць выкладаньня. Шырока разгарнуць дадатковыя формы партвыхаваньня прыцягваючы для работы ў іх гарадзкі і раённы партактыў. Праз усю сыстэму марксыцка-ленінскай прапаганды мабілізаваць партарганізацыі на вывучэньне прынцыпаў бальшавізму і асноўных рашэньняў партыі па сашы ялістычным будаўніцтве, кіруючыся паказаньнямі т. Сталіна.

3) Райкому КП(б)Б і парткомам прадпрыемстваў забясьпечыць сетку партыйнай асьветы стала працуючымі прапагандыстымі, стварыўшы ўмовы для іх падрыхтоўкі.

IV. Прапанаваць Культпропу ЦК КП(б)Б вылучыць брыгаду для правядзеньня растлумачальнай работы ў Барысаўскай арганізацыі давай пастановы і дапамогі ў наладжваньні марксыцка-ленінскага выхаваньня апошняй.

V. Гэтую пастанову апублікаваць у друку.

Пастанова ЦК КП(б)Б

аб фактах разбазарваньня хлеба ЗРК Бабруйскага лесакамбінату

ЦК канстатуе, што кіраўніцтва ЗРК Бабруйскага лесакамбінату ў асобе старшыні т. Каплана, замест выкананьня простых дырэктыў партыі аб максымальнай эканоміі ў выдаткаваньні хлеба, займалася рвацтвам і безадказным выдаткаваньнем хлебных фондаў, бескантрольнай выдачай наборных дакумантаў, самавольным пераводам кантынгенту з ніжэйшых катэгорый ў вышэйшую, што прывяло да разбазарваньня 51.520 кілг хлеба за адны толькі 4 месяцы 1932 г.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі і дырэкцыя камбінату замест прыняцьця рашучых мер барацьбы за жорсткую эканомію хлеба і наладжваньне сапраўднага рабочага кантролю прымірэнча аднесьліся да гэтых вьявішч, чым фактычна садзейнічалі разбазарваньню хлеба.

Выходзячы з гэтага ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1) Пацьвердзіць пастанову Бюро Бабруйскага РК КП(б)Б ад 15.V—32 г. аб выключэньні старшыні ЗРК Капла на з радоў КП(б)Б.

Даручыць пракуратуры Рэспублікі ў дэкадны тэрмін разгледзіць справу ЗРК Бабруйскага Лесакамбінату аб разбазарваньні хлеба і безкантрольнай выдачы наборных дакумантаў і вінаватых прыцягнуць да судовай адказнасьці.

2) У адносінах сакратара парткому Бабруйскага Лесакамбінату т. Рабкіна, дырэктара камбінату т. Тарасава і старшыні ФЗМК тав. Батукава, лічыць рашэньне Бабруйскага РК недастатковым і прапанаваць перагледзець у бок узмацненьня спагнаньня.

3) Прапанаваць Бабруйскаму РК КП(б)Б прыцягнуць да партыйнай адказнасьці загадчыкаў цэхаў камбінату, якія яўна перавялічылі заяўкі на атрыманьне наборных дакумантаў.

4) Папярэдзіць усе партыйныя, прафсаюзныя, каапэрацыйныя і гаспадарчыя арганізацыі, што КП(б)Б будзе прыцягваць да самай суровай партыйнай адказнасьці членаў партыі за факты разбазарваньня хлеба, неэкаманомнага яго выдаткаваньня, неправядзеньня належнай барацьбы з фактамі разбазарваньня і неналаджваньне масавага кантролю за штодзённым выдаткаваньнем хлеба.

Пастанову апублікаваць ў друку.

Пастанова

Цэнтральнага штабу па месячніку штурму дарбудаўніцтва

За ўзорную работу па правядзеньні месячніка штурму бездарожжа з 15 лютага да 15 сакавіка г. г. прэм'яваць наступныя арганізацыі і асобы:

1. Газэту «Калгасьнік Беларусі» за сыстэматычную арганізацыю грамадзкасьці на правядзеньне месячніка шляхам асьвятленьня на старонках газэты перадавых арганізацый іганьбаваньня адстаючых і шляхам пасылкі ў раёны брыгад для непасрэднай арганізацыі сацспаборніцтва паміж раёнамі, калгасамі і аднаасобнікамі ў выніку чаго грамадзкасьць у радзе месц перавыканала пляны вывазкі матар'ялаў, прэм'яваць лёгкавым аўтамабілем «Форд».

2. Рабселькораў «Калгасьніка Беларусі» Сьвірко Х.Ф., Ксендзова В., Шпакоўскага Алеся і супрацоўнікаў —брыгадзіраў гэтай-жа газэты Нука А., Пархіміовіча В., і Зубровіча— за актыўны ўдзел у правядзеньні месячніка прэм'яваць першых трох па 100 руб. кожнага і астатніх трох кожнага гарнітурамі.

3. Калгасы: Сьценькі Разіна, Жабярыцкага сельсавету і Новы мір, Шэйскага сельсавету Крупскага раёну выканаўшых плян вывазкі на 100 проц.—першы — 150 куб. м., другі — 200 куб м., прэм'яваць грашыма на ўтрыманьне ясьляў па 500 руб.

4. Дарінспэктара Крупскага раёну тав. Ізьмера за ўмелую арганізацыю работ у выніку чаго гадавы плян лесаматар'ялаў для дарбудаўніцтва выкананы на 101 проц., а каменьня вывіш пляну вывезена 160 куб. м. для мясцовых дарог і пераключэньня 3-х дармайстраў і 3-х дарарганізатараў на камнезагатоўкі для дарог дзяржаўнага значэньня прэм'яваць — награжаньнем у дом адпачынку на месяц.

5. Калгасы «Расьсьвет» Круцкоўскага сельсавету і «Беларускі Батрак» Салішчанскага сельсавету, Расонскага раёну перавыканаўшых плян вывазкі першы на 130 проц., другі на 129 процантаў, прэм'яваць грашыма на ўтрыманьне ясьляў па 500 руб. кожнаму.

6. Калгас «Акцябр» Полацкага раёну выканаўшага плян на 135 проц. прэм'яваць выдачай грошай на ўтрыманьне ясьляў 500 руб.

7. Аднаасобнікаў Расонскага раёну Наўрава Янку вёскі Куры Клясьціцкага сельсавету выканаўшага плян вывазкі на 113 проц., Літвінава Янку Ражнова Селяўшчынскага с-с, Літвінава Ягора і Кубачова Зьмітрука выканаўшых плян вывазкі на 140 проц. кожны, прэм'яваць выдачай кожнаму па пары бацінак, а Бяляеву П. той жа вёскі і сельсавету выканаўшага плян на 175 проц., Кукаронка Васіля той-жа вёскі і сельсавету выканаўшага плян на 200 проц., і Беляева Яўхіма той жа вёскі выканаўшага плян на 225 проц. прэм'яваць выдачай кожнаму па пары ботаў.

Вопыт будаўніцтва палітэхнічнай школы—

у аснову падрыхтоўкі да новага навучальнага году

БАРАЦЬБА З „КАРЭННЫМ НЕДАХОПАМ“

Пастанова ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб школе патрабуе зьнішчэньня «карэннага недахопу», узьнікшага якасьці работы, камуністычнага выхаваньня нашай зьмены і барацьбы за палітэхнічную школу.

Нельга сказаць, што школы Асіпавіцкага раёну шырокай хваляй улаліся ў рэчышча школ, якія ідуць на конкурс. Праўда, мы маем некаторыя сельсаветы, у якіх з 6 пачатковых школ уключыліся ў конкурс 4, але разам з гэтым ёсьць і школы ўзвышанага тыпу (Лапіцкая ШКМ), што ідуць мімо конкурсу.

У ліку першых школ, якія ўключыліся па раёне ў конкурс, была Асіпавіцкая ўзорная школа ФЗС-I. Першыя арганізацыйныя крокі па конкурсе былі зроблены арганізаванай пяцёркай, якая распрацавала 5 маршрутаў, ушчэпшуны ў конкурс усіх настаўнікаў, вучняў і прадстаўнікоў грамадзкасьці школьнага савету.

Пытаньне аб конкурсе было пастаўлена на вучнёўскай ячэйцы КСМ, атрадах Ю. П. і групавых сходах. Усе групы школы ўключыліся ў конкурс з такім напрамкам, што малодшыя групы ў аснову працы бяруць хутчэйшую ліквідацыю прарываў, вы кананьне сацмоў і разгортваньне лепшых сацмэтадаў працы, а старэйшыя стваральць разам з гэтым брыгады для працы па конкурсе. Адбыўся рад паседжаньняў, на якіх выяўляліся недахопы ў рабоце і мерапрыемствы для зьнішчэньня іх. З гэтых мерапрыемстваў і дасягненьняў трэба адзначыць наступныя:

Калі ў мінулым навучальным годзе проц. другагодніцтва па школе складаў 8, дык у гэтым годзе ставіцца задача зьнізіць гэтую лічбу на палову, а для гэтага яшчэ больш павінна быць разгорнута работа з адстаючымі вучнямі.

У галіне работы з адстаючымі ўжо ёсьць дасягненьні, цэлы рад гурткоў адстаючых, займаючыя з 2-га паўгодзьдзя, даў станоўчыя вынікі: напрыклад, вучні, якія рабілі раней у сярэднім па рускай мове на 50 слоў 83 памылкі, зараз на 120 слоў робяць 13 памылак, або на 50 слоў рабілі 23 памылкі, зараз на 120 слоў робяць 8 памылак.

Рад вучняў па матэматыцы з адстаючых зрабіліся пасьпяховымі, гэта-ж самае можна сказаць і пра беларускую мову.

Да гэтага часу ўзорная школа дала для раённага насельніцтва 6 лекцый; яны працягваюцца і далей згодна складзенаму пляну.

У школе апроч сьлясарнай і сталярнай майстэрні ёсьць рабочы пакой для работы па дрэве і мэталі; у апошні час ён пашыраецца ўвядзеньнем картанажнага аддзелу. Работа ў майстэрнях і рабочым пакоі падпарадкавана вучэбным плянам школы. Плян работ сьлясарнай і сталярнай майстэрняў абгаварваецца на вытворчых нарадах. Разам з тым адбываецца на чыгунны вытворчая практыка для вучняў.

У трэці трыместр школа ўступіла са значнымі дасягненьнямі ў галіне вучобы, аб чым сьведчаць чарговыя ўлковыя зводкі па групах за 2 тры мастр.

Побач з дасягненьнямі ёсьць і прарывы, якія трэба ліквідаваць у бліжэйшы час. Так, трэба адзначыць слабую работу вытворчых нарад, не абходнасьць папаўненьня майстэрняў, габінэтаў хіміі, прыродазнаўства, пераабсталяваньня фізычнага габінэту; школьная бібліятэка патрабуе грунтоўнага перагляду і папаўненьня. Не на належнай вышыні і павышэньне кваліфікацыі настаўнікаў па школе: ліх завочнікаў складае каля 14 проц., не разгорнута марксыцка - ленінская асьвета сярод настаўнікаў, слаба разгорнута работа вучнёўскіх дабраахвотных таварыстваў.

Работа з грамадзкасьцю ў апошні час заняпала, а што яна можа даць бліскучы вынік, сьцьвярджае наступны факт. Спачатку бягучага году за гадчык школы Ю. Яройенка, жадаючы стварыць пры школе рабочы пакой для першага канцэнтру, ставіць аб гэтым пытаньне на пашыраным паседжаньні МК чыгуначнікаў. Даклад яго сярод рабочых чыгуначнікаў меў вялікі посьпех, рабочыя па дакладзе заг. школы высунулі сустрэчны плян — замест 6 дзіцячых варштатаў у рабочым пакоі, зрабіць 8. Яны-ж далі рабочую сілу, некаторы матар'ял, школа падрыхтавала памяшканьне — і зараз мы маем у школе рабочы пакой.

Працуючыя да гэтага часу ў школе гурткі (палітгурток, краязнаўства і інш.) недастаткова разгарнулі работу, ды і тая праходзіць не рэгулярна. Між тым іх работа зараз вельмі неабходна; краязнаўчы гурток павінен неадкладна ў сваіх працах, уключыўшыся ў навукова дасьледчы паход, даць матар'ял для складаньня райпляну 2-й пяцігодкі.

Разам з гэтым трэба ўзварушыць работу групавых штодзённак і насьцен газэты, у якіх неабходна адлюстраваць праходжаньне конкурсу па нашай школе, зьвярнуўшы ўвагу на выкананьне вучэбных плянаў, спазьненьні і г. д. Неабходна стварыць пераходны сьцяг для лепшых груп.

З наступленьнем веснавога часу павінна ў школе ажывіцца экскурсыйная работа, як адзін з лепшых мэтадаў выкладаньня.

Зьнішчэньне гэтых недахопаў зьяўляецца значным крокам у рэалізацыі пастановы ЦК аб школе. Павышэньне якасьці работы школы разам з адпаведнай грамадзка - карыснай працай магчыма толькі пры шырокім удзеле ўсёй грамадзкасьці і таму трэба шырока разгарнуць работу сярод грамадзкасьці, каб да кінцу падыйсьці ўзорнай школе як належыць.

А. Немцоў.



Лекцыі па прыродазнаўству.

ХРОНІКА КОНКУРСУ

У МЕНСКУ ПРАВОДЗІЦЦА РЭЙД.

Менск спачатку Усебеларускага конкурсу на лепшую палітэхнічную школу быў у глыбокім тыле, аб чым «Савецкая Беларусь» своячасова сыгналізавала. Зараз работа па конкурсу значна ўзьнялася.

Гарана, гарком саюзу працасьветы і рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь» праводзяць рэйд па праверцы рэалізацыі школамі пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, падрыхтоўкі да новага навучальнага году, па разгортваньні конкурсу.

Пачынаецца работа па праверцы дагавораў паміж школамі і прадпрыемствамі.

36 ФЗС.

36-я школа ўключылася ў конкурс на лепшую палітэхнічную школу і лепшага настаўніка.

На завод «Полымя Рэвалюцыі» вылучаны дакладчык для азнаямленьня шырокіх рабочых мас з конкурсам.

Сярод бацькоў і вучняў праведзена растлумачальная праца.

Школа рыхтуецца да новага навучальнага году: зданы праекты на пабудову сталоваў і майстэрні. У ТПО пераведзены грошы на тлушчы, забраніраваны вучастак на посеў бульбы. Зроблены свай майстэрняй камплект абсталяваньня для нулявой групы.

Наладжаны дзяжурствы камсоду ў часе летняга адпачынку для набыцьця пісьмовых прылад і сшыткаў. Зроблена перапісь дзяцей ад 6½ год і рас пачата ўкамплектаваньне школы.

ДРЫСЕНСКІ РАЁН.

Па Дрысенскім раёне ва Ўсабалаўскі конкурс на лепшую палітэхнічную школу ўключылася 7 школ. Першай ўключылася ў конкурс Боркавіцкая ШКМ. Гэтая-ж школа зьвярнулася з адозвай да ўсіх школ, прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў раёну праз газэту «Зьезда на рубяжы», узяўшы на сябе цэлы рад абавязкаў на лепшае заканчэньне навучальнага году.

Аднак, зусім недастаткова разгорнута праца па конкурсу ў астатніх школах.

ПЕТРЫКАЎСКІ РАЁН.

Абвешчаны конкурс на лепшую школу і настаўніка па раёне. Вылучана 1.500 руб., для прэм'яваньня лепшых школ, настаўнікаў, культармейцаў.

Першай па раёне ўключылася ў конкурс Капцэвіцкая ФЗС, якая правяла нараду ўсіх асьветнікаў сельсавету.

Абвешчаны конкурс на лепшую брыгаду па школе, лепшага вучня, настаўніка. Усе групы ахоплены сацумовамі. У пачатку году ФЗС ня мела ніводнага ўдарніка, цяпер у школе 120 сапраўдных ударнікаў з агульнага ліку 320 вучняў. Распачата работа па арганізацыі выстаўкі прац ФЗС за год. Зьнізіліся на 10—15 проц. спа зьненьні і прагулы вучняў. 70 проц. настаўнікаў школы абвясьцілі сябе ўдарнікамі, заключылі паміж сабой індывідуальныя сацумовы. Сіламі вучняў — культармейцаў ліквідавана ня пісьменнасьць сярод 25 рабочых заводу.

СЬВЯЦКАЯ ШКОЛА.

Сьвяцкая 4-х камплектная школа, Рагачэўскага раёну, па баявому ўключылася ва Ўсебеларускі конкурс на лепшую палітэхнічную школу і настаўніка.

Вучнёўская маса мабілізавалася на зьнішчэньне «карэннага недахопу», пры чым вучнёўскае самакіраваньне прымае ўсе захады каб вучняў, якія адстаюць падцягнуць і даць магчымасьць ім перайсьці ў наступную групу. Праца як настаўнікаў, так і паасобных груп школы шырока асьвятляецца ў нізавым друку.

Вучні, абмеркаваўшы пастанову аб конкурсе на лепшую школу, прынялі пастанову наведваць школу да канца навучальнага году на 100 проц.

Настаўнікі школы шырока прымаюць удзел у выданьні штодзённак у брыгадах калгасу імя Сьвярдлова.

Узмацніць тэмпы пад ыхтоўкі да новага навучальнага году

Падрыхтоўка да новага навучальнага году па Бягомльскім раёне ідзе нездавальняюча. Будаўніцтва новых будынкаў для школ ідзе марудлівымі тэмпамі.

Ня зусім закончана яшчэ будаўніцтва Мсьціслаўскай ШКМ, таго будынку, які павінен быў паступіць у эксплёатацыю ў пачатку бягучага навучальнага году.

Зусім марудна будуюцца: Берасьвіўская, Зялелаўская, Чысьцянская, Хмялёўская школы.

З боку паасобных сельсаветаў (Мсьціслаўскі) ёсьць нездаровыя тэндэнцыі ў кірунку скарыстаньня былых кулацкіх дамоў пад школу. Былы кулацкі дом у в. Пядынь быў сельсаветам праданы на знос, у той час, калі школа (польская) знаходзіцца ў зусім неадпавядаючым памяшканьні.

Патрабавалася ўмяшаньне Райана і прэзыдыуму РВК, і тады толькі справа была вырашана ў станоўчым напрамку.

З боку загадчыкаў школ раёну да гэтага часу не праяўлена ўвага да падрыхтоўкі абсталяваньня і памяшканьняў да новага году.

Ёсьць праўда некаторыя захады з боку аднаго загадчыка Бярэзінскай ШКМ тав. Ралёнка: складзены пляны рамонту, каштарысы, вядзецца работа па замацаваньні аднаго будынку за школай.

З боку грамадзкіх інструктароў у сельсаветах таксама ніякай работы па падрыхтоўцы не вядзецца.

РВК, Бярэзінскі сельсавет, Райана рашучых мер ня ўжываюць. Трэба безадкладна пачаць самую шырокую работу па падрыхтоўцы да новага навучальнага году шляхам мабілізацыі грамадзкасьці, шляхам поўнага скарыстаньня мясцовых рэсурсаў.

Макарэвіч.

За праверку дагавораў паміж школамі і прадпрыемствамі

Завод „Ударнік“—у перашыхрадох

Улічваючы важнае значэньне Усебеларускага конкурсу на лепшую палітэхнічную школу і лепшага настаўніка, агульны сход рабочых заводу «Ўдарнік», ІТР і служачых, разам з 3-яй ФЗС, якая прымацавана да заводу, вынес пастанову ўключыцца ў конкурс і ўзяць наступныя абавязацельствы:

— Вылучыць брыгаду з прадстаўнікоў дырэкцыі, заўкому, рабочых, КСМ, настаўнікаў і адміністрацыі школы і піянэрпрацаўніка для праверкі дагавору паміж 3-яй ФЗС і заводам.

— Дапамагчы школьнай сьлясарнай майстэрні шляхам перадачы такарнага варштату па мэталі, сьлясарных варштатаў і розных інструмантаў.

— Вылучыць брыгаду з 3-х рабочых і інструктара для ўстаноўкі школьных варштатаў, рамонту інструмантаў і школьнага інвэнтара.

— Скласьці камісію для выпрацоўкі пляну палітэхнізацыі на 1932-33 навучальны год з прадстаўнікоў дырэкцыі, ІТР, настаўнікаў і КСМ, якой даручыць вызначэньне рабочых месц на цэхах заводу для вучняў.

— Забясьпечыць школьныя майстэрні неабходнымі матар'ялам.

Інструктар сьлясарнай майстэрні ФЗС—I .т Пагоскі, які вылучаны на гэтую пасаду чыгуначнаю грамадзкасьцю.

МАЮЦЬ ПРАВА НА ПРЭМІЮ

Польская ШКМ Замастоцкага сельсавету (Менскі раён) з першых дзён навучальнага году стала набіраць баявыя тэмпы. Пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б прапрацаваны настаўніцкім калектывам, а таксама на сходах калгаснікаў і даведзены да кожнага вучня.

Для ліквідацыі «карэннага недахопу» арганізаваны брыгады, якія паміж сабой заключылі сацумовы і энэргічна змагаюцца за якасьць вучобы. У выніку гэтага да часу абсьледваньня школы інспэктарам Гарана (15-II-32 г.) мелася наступная дасягненьні: праграма па I, II і V групах перавыконваецца. Якасьць выкананьня праграмы добрая. Працоўная дысцыпліна надзвычайна добрая, паасобныя вучні брыгады, клясы, падцягваюць адзін аднаго праз сацспаборніцтва і дапамогу адстаючым.

Больш слабей выконвалася праграма III і IV групамі. Прычына гэтаму зьмена двух настаўнікаў на працягу навучальнага году. Але з другога паўгодзьдзя з прызначэньнем настаўніка Быкаўскага і гэтыя групы ўзялі належныя тэмпы. Адным з цэнтральных пытаньняў работы школы — стала палітэхнізацыя. Школа ў самы кароткі час мабілізавала ўсю калгасную і школьную грамадзкасьць, арганізавала рабочы пакой для I канцэнтру, наладзіла работу для вучняў V групы ў чатырох калгасных майстэрнях: у сталярні, кузьні, шавецкай і кравецкай. Кіраўнікамі работай вучняў у майстэрнях вылучаны кваліфікаваныя майстры. Работа ў майстэрнях і рабочым пакоі сплянавана і падпарадкавана тэарэтычным матар'ялам. Абсталяваньне для рабочага пакою сабрана сярод калгаснікаў і шэфаў.

Школа разьвяла ўласных трусоў. Ўзяла шэфства над трусаводнай гаспадаркай калгасу. Вытворчая работа ў трусаводнай гаспадарцы падпарадкоўецца вучэбна - выхаваўчай рабоце школы.

У школе шырока разгорнута сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Сацспаборніцтва і ўдарны рух зьяўляюцца асноўным мэтадам работы школы. Ход сацспаборніцтва асьвятляецца ў што дзённых бюлетэнях, якія выпускаюцца кожнай клясай. Кожны месяц сацспаборніцтва правяраецца штабам. Пад кіраўніцтвам штабу праводзяцца зьлёты ўдарнікаў, арганізуецца ўлік працы ўдарных брыгад і ўдарнікаў. Школа заключала сацумову з Замастоцкай школай, V група з V групай Калодзішчанскай ШКМ. Працуюць добра гурткі: антырэлігійны, палітычны, радыё, першай дапамогі, харавы і драматычны, а таксама ячэйкі АСО, бязбожнікаў, МОПР, Чырвонага крыжу.

Школа прарабіла вялікую работу ў справе барацьбы за стварэньне санітарна - гігіенічных умоў у школе і дома. У гэтай справе ўсім школам Менскага раёну і гораду патрэбна ўзяць прыклад. У школе падтрымліваецца надзвычайна добрая чыстата, па клясах устаноўлены рукамыйнікі, закрытыя скрынкі, для сьмецьця, кожны вучань мае свой ручнік, асобную палічку для кніг, сшыткі за год заходзяцца ў паасобных канвэртах. Дзяжурны санітар (з павязкай Чырвонага крыжу) перад заняткамі робіць агляд вучняў групы, іх рэчаў, заносіць вынікі агляду на паасобную таблічку і з прыходам настаўніка на лекцыю дакладвае аб вынках агляду.

У сувязі з прапрацоўкай прыродазнаўчага матар'ялу, школай быў наладжаны збор гароднага насеньня, а таксама агрупрапаганда сярод калгаснікаў.

Пры актыўным удзеле праўленьня калгасу і калгаснікаў арганізавана ў школе досьць добра гарачае сьнеданьне для вучняў. Настаўніцкі калектыў энэргічна вядзе змаганьне за аўладаньне тэхнікай пэдагагічнага працэсу шляхам азнаямленьня з навейшай мэтадычнай літаратурай, азнаямленьня з работай лепшых школ і настаўнікаў.

Школа ўключылася ў конкурс на лепшую школу і настаўніка, пасьля чаго яшчэ з большай энэргіяй калектыў школы ўступіў у барацьбу за палітэхнічную школу Маркса - Леніна. Для азнаямленьня з дасягненьнямі ў рабоце школы пэдкалектыў школы па ініцыятыве вучняў і калгаснікаў запрасіў інспэктароў Гарана і НКА на падзітуленьне работы ў канцы навучальнага году.

Дасягненьні ў рабоце школы зьяўляюцца вынікам мабілізацыі ўсёй працоўнай грамадзкасьці калгасу імя Дзяржынскага на выкананьне пастановы ЦК і зьяўляецца вынікам правільнай расстаноўкі пэдагагічных сіл, што, галоўным чынам, залежала ад энэргіі і ўмелага кіраўніцтва загадчыка школы, вылучэнкі тав. Мазур, і добрага мэта дыста тав. Вінцэвіч.

Школа цалкам, загадчык школы тав. Мазур і мэтадыст Вінцэвіч маюць поўнае права на атрыманьне прэміі.

Інспэктар Гарана.
Навуменка.

БЕЗ КАНЯ ПРАМЫСЛОВАЙ АБАРОНЫ КРАІНЫ. (С. Будзённы).

Ф.Салавейчык, Л. Савельзон

Барацьбу за колькасьць не адрываць ад барацьбы за якасьць

Бярэзінскі камбінат скончыў I-шы квартал 1932 г. з вялікімі дасягненьнямі ў выкананьні прамфінпляну па колькасных паказьніках. Гэтых перамог на фронце выкананьня колькасных паказьнікаў прамфінпляну камбінат дабіўся дзякуючы зьмене былога апартуністычнага кіраўніцтва, дзякуючы разгорнутай барацьбе ўсяго рабочага калектыву пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі за рэалізацыю гістарычных указаньняў тав. Сталіна.

Бярэзінцы выйшлі з прарыву

Дасягнутыя перамогі ў выкананьні колькасных паказьнікаў прамфінпляну Бярэзінскі камбінат змог замацаваць і ўзяўшы ў першым квартале тэмпы за раз ня толькі ня здадзены, а наадварот павышаны.

Гэта перш за ўсё падцьвярджае правільнасьць вынікаў аробленых з уроку Бярэзінскага камбінату аб тым, што там, дзе партыйная, прафсаюзная і камсамольская арганізацыі ўзначальваюць рабочыя масы ў іх барацьбе за выкананьне прамфінпляну, за першую бальшавіцкую пяцігодку—там магчыма дабіцца посьпехаў у гэтай барацьбе. Гэта добра даказана і толькі малачеры і апартуністы могуць пярэчыць проці гэтага.

Бярэзінскі камбінат, які дзякуючы правільнаму кіраўніцтву партыйнай арганізацыі вышаў з паласы прарываў у выкананьні колькасных паказьнікаў прамфінпляну, мае яшчэ цэлы рад прарываў у выкананьні якасных паказьнікаў.

Гэтыя прарывы ў першую чаргу зьяўляюцца вынікам недастатковай барацьбы кіраўніцтва камбінату на гэтым адказьнейшым зучастку выкананьня прамфінпляну. Высунутыя пралетарскай грамадзкасьцю канкрэтныя мэтады і формы барацьбы за якасьць прадукцыі (грамадзкія заслоны якасьці, брыгады якасьці і інш.) не знайшлі яшчэ свайго прытулку на камбінаце.

У гэтым прычыны дрэннай якасьці выпусканай прадукцыі.

Абсталяваньне яшчэ абязьлічана

Камбінат увесь час мае значныя недахопы ў рамонце абсталяваньня, абслугоўваньне якога да рэчы поўнасьцю абязьлічана.

Павярхоўны, несваячасовы рамонт абсталяваньня выклікае ў сваю чаргу вялікую колькасьць браку, які па камбінату дасягае ганебнейшай лічбы—13 проц. вышэй пляну. Дрэнны рамонт варштатаў выклікае таксама пагоршаньне якасьці прадукцыі.

Рамонтная брыгада аўтаматнага цэху Шымазскага знаходзіцца адзнай з горшых брыгад камбінату. Па яе віне тыднямі прастойваюць аўтаматы. Часамі аўтаматы пасьля рамонту працуюць значна горш, чымся да рамонту. Асобныя аўтаматы даюць да 20-ц проц. браку, замест устаноўленай нормы—максымуму 7 проц.

Аб магчымасьці дазадзеньня колькасьці браку да мінімуму сьведчыць прыклад аўтамату № 4, які пасьля добрага рамонту і дзякуючы добраму тэхнаглядзу дабіўся зьнижэньня колькасьці браку з 40-45 проц. да 5 проц., гэта значыць нижэй устаноўленай нормы.

Зусім дрэнная справа з рамонтам мацыжак здымальнага цэху. Вялікая колькасьць мацыжак зусім не працуе з прычыны няспраўнасьці. Аднак, яны не рамантуюцца. Працуючыя мацыжы даюць таксама вялікую колькасьць браку. Мацыжка № 9 пасьля доўгага рамонту зараз дае 40-45 проц. браку, замест устаноўленай нормы ў 8 проц. Такое-ж становішча і на мацыжках №№ 11, 12, 14, 20. З-за дрэннага павярхоўнага рамонту гэтыя мацыжкі ня толькі ня зьмяншылі колькасьці браку, а наадварот падвысілі.

З-за дрэннага рамонту 1 няспраўнасьці здымальных мацыж маюць месца частыя выпадкі гарэньня касэт з саломкай, якое прыносіць вялікія страты і павялічвае колькасьць траўматычных захворваньняў.

Чаму сярнічкі дрэнныя?

Асноўнымі хібамі ў якасьці сярнічак зьяўляюцца шматлікія так званыя «ацёкі» і недамочкі галовак. Гэтыя ацёкі і недамочкі атрымліваюцца з-за нядбайнасьці макалеў аўтаматаў. Макаль 2-ой зьмены аўтаматнага цэху Мікуліч з-за нязважлівых адносін да працы выпусьціў за сакавік 30 касэт экспартнай саломкі з ацёкамі, якія прышлося забраковаць. У гэты-ж час радам працуючы Макаль Ржавушкі, які добра сочыць за работай аўтамату і становішчам масы, за апошнія паўтара месяца не дапусьціў ніводнага выпадку ацёку і недамочкі галовак.

Блыскучыя прыклады барацьбы з бракам, за добрую якасьць выпусканай прадукцыі паказваюць гасразьліковыя брыгады. Гасразьліковая брыгада здымальнага цэху імя Максіма Горкага акрамя значнага перавыкананьня прамфінпляну дабілася поўнага зьнішчэньня браку. За апошнія 3 месяцы ніводная касэта зробленая брыгадай ня была забракавана ў той час, як працуючыя на мацыжы № 13 работніцы Каразэнак і Добгаполец за красавік выпусьцілі 12.000 браканаваных каробак.

Аўтамат № 5, на якім працуе зарад чыкам Гайдук, дае штодзень 100-110 кгр. браку, замест устаноўленай нормы 40 кгр. Вялікі процант браку аўтамату № 5 атрымліваецца таму, што зарадчык Гайдук, замест таго, каб уважліва сачыць за заладкай і рукам касэт, закладвае касэту і адыходзіць «адпачыць». У гэты час аўтамат выпускае амаль адзін брак.

Гэтыя ганебныя факты амаль «узконены» на Бярэзінскім камбінаце. Злачынныя, мяжуючыя са шкодніцтвам, факты масавага выпуску браку, дрэннай якасьці прадукцыі не атрымліваюць належнага адпору з боку прамадзкасьці камбінату. Злосныя бракаробы—шкоднікі сацыялістычнай прамысловасьці ня прыцягнуты да суровай адказнасьці пралетарскай грамадзкасьцю камбінату.

Аб браку і вінавайцах

Да апошняга часу ня гледзячы на пастановы і ўнясеньне спэцыяльнага пункту ў коллегавор яшчэ ня ўведзена матар'яльная адказнасьць адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу і работніка за прычыненьне прадпрыемству страты з-за браку па іх віне. Гэтае мерапрыемства, ўведзенае часткова на частцы прадпрыемстваў Барысава дало надзвычай добры эфэкт.

Устанаўленыя матар'яльнай адказнасьці за брак па віне рабочага павін на зараз-жа быць уведзены ў практыку камбінату. Нельга цярпець такога становішча, каб з-за нядбайства адзінак камбінат меў страты ад браку і дрэннай якасьці прадукцыі.

За апошні час меді месца выпадкі выпуску на рынак прадукцыі дрэннай якасьці, якая падлягае забраканьню. Адзнай з асноўных прычын, выклікаўшых такія факты, зьяўляецца зусім слабы тэхнічны кантроль над якасьцю выпусканай прадукцыі.

З 15-га чэрвеня ф-ка «Пралетарская Перамога» пераходзіць на выпрацоўку выключна экспартнай прадукцыі. Таксама пашыраецца выпрацоўка на экспарт фанерным заводам «Чырвоная Бярэзіна». Гэта ўскладвае на рабочы калектыў і кіраўніцтва камбінату адказнейшыя задачы барацьбы за ўзорную якасьць экспартнай прадукцыі

АБ ПЕРАБУДОВЕ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ БССР

ПАСТАНОВА ЦК КП(б)Б

1. ЦК КП(б)Б адзначае своячасовасьць і вялізарнае палітычнае значэньне пастановы ЦК УсеКП(б) ад 23 красавіка г. г. аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый, якая будзе садзейнічаць яшчэ большаму аб'яднаньню шырокіх колаў савецкіх пісьменьнікаў і мастакоў вакол камуністычнай партыі, яшчэ большай мабілізацыі на актыўны ўдзел у пабудове бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, на стварэньне літаратурна-мастацкіх твораў, вартых нашай вялікай эпохі.

2. ЦК канстатуе, што пралетарскія літаратурна-мастацкія арганізацыі, у тым ліку і БелАПП, якія на пэўным этапе, калі ў літаратуры быў яшчэ значны ўплыў чужых элемэнтаў, што асабліва ажывіліся ў першыя гады НЭП'у, а кадры пралетарскай літаратуры былі яшчэ слабы, адыгралі станоўчую ролю ў сэнсе ўмацаваньня пазыцый пралетарскіх пісьменьнікаў. «У сучасны момант, калі пасьпелі ўжо вырасьці кадры пралетарскай літаратуры і мастацтва, выявіліся новыя пісьмен нікі, мастакі з заводаў, фабрык, калгасаў, рамкі існуючых пралетарскіх літаратурна - мастацкіх арганізацый (ВОАПП, РАПП, РАПМ і інш.) становяцца ўжо вузкімі і тармозяць сур'ёзны размах мастацкай творчасьці».

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Ліквідаваць Беларускую Асацыяцыю Пралетарскіх Пісьменьнікаў (БелАПП).

2. Правесьці арганізацыю Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў, што стаіць на пляцформе савецкай улады і імкнуцца ўдзельнічаць у сацыялістычным будаўніцтве.

Усе пісьменьніцкія арганізацыі падначаліць аргкамітэту. Перадаць у распараджэньне аргкамітэту літаратурныя часопісы.

Культпропу ЦК забясьпечыць шырокую прапрацоўку пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый, дамогшыся максымальнай мабілізацыі ўсяго фронту літаратуры і мастацтва на вырашэньне задач сацыялістычнага будаўніцтва.

ЦК КП(б)Б.

27 мая 1932 г.

ПАСТАНОВА

Сакратарыяту Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў

Беларуская Асацыяцыя Пралетарскіх Пісьменьнікаў, узьнікшая пад кіраўніцтвам КП(б)Б, у той час, калі літаратуры Савецкай Беларусі быў яшчэ значны ўплыў варожых элемэнтаў, змагаючыся за генэральную лінію партыі ў літаратуры, здолела выявіць і выхаваць шэраг пралетарскіх паэтаў і пісьменьнікаў, стаўшы здолёва-вядучай арганізацыяй савецкай літаратуры БССР.

На даным этапе рамкі БелАПП сталі вузкімі і перашкаджаюць разьвіцьцю савецкай літаратуры. Замест мабілізацыі ўсіх савецкіх пісьменьнікаў ва кол задач сацыялістычнага будаўніцтва Беларуская Асацыяцыя Пралетарскіх Пісьменьнікаў, ня здолеўшы правесьці карэнную перабудову сваёй работы ў адпаведнасьці з апошнімі дырэктывамі партыі, была адарвана ад значных груп пісьменьнікаў, якія спачуваюць сацыялістычнаму будаўніцтву культывала гуртковую замкнутасьць і абасобленасьць, мела элемэнты групоўшчыны ў арганізацыі, што ў зьніку аддаляла яе ад палітычных задач сучаснасьці.

Гістарычная пастанова ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый, ліквідуючы Асацыяцыю Пралетарскіх Пісьменьнікаў з мэтай аб'яднаньня ўсіх пісьменьнікаў, якія падтрымліваюць пляцфэрму савецкай улады і імкнуцца ўдзельнічаць ў сацыялістычным будаўніцтве, у адзіны Саюз Савецкіх пісьменьнікаў, маюць глыбока палітычнае значэньне для росквіту савецкай літаратуры і зьяўляюцца вялікім пачаткам нозага этапу за магнітабуды ў літаратуры.

Творчы ўздым і энтузіязм, якімі опатканы гэтыя гістарычныя пастановы шырокімі коламі савецкіх пісьменьнікаў БССР, сьведчаць пра неабходнасьць менавіта такой карэннай рэарганізацыі літаратурна-мастацкага фронту.

На падставе гэтага сакратарыят БелАПП абвяшчае Беларускую Асацыяцыю Пралетарскіх Пісьменьнікаў ліквідаванай, часопіс «Маладняк», сродкі і маёмасьць Асацыяцыі сакратарыят БелАПП перадае аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР.

Літаратурныя гурткі на фабрыках і заводах, арганізаваныя БелАПП, працягваюць сваю работу пад кіраўніцтвам аргкамітэту.

Сакратарыят БелАПП: **М. Лынькоў, П. Галавач, Андрэй Александровіч, Р. Мурашка, К. Дунец, Ілары Барашка, Л. Бэндэ, Я. Лімановуські, Іткін, Гараўскі, Швэйдэль.**

1-га чэрвеня 1932 году.

Першае паседжаньне аргкамітэту БССП

1-га чэрвеня адбылося першае паседжаньне аргкамітэту Беларускага Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў, створанага літаратурнымі арганізацыямі БССР у сувязі з пастановай ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый.

На паседжаньні вырашаны шэраг арганізацыйных пытаньняў.

Прэзыдыум аргкамітэту абраны ў складзе т. т. **Клімковіча** (старшыня), **М. Лынькова** (адказны сакратар), **К. Чорнага, А. Александровіча** і **Х. Дунца.** Кандыдаты—т. т. **Гараўскі** і **Швэйдэль.**

Дэлегацыя ў аргкамітэт Усесаюзнага Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў выключана з складзе т. т. **М. Лынькова, К Чорнага, А. Александровіча і І. Харыка.**

Створаны камісіі: па друку—у складзе т. т. **М. Лынькова, Я. Лімановуська** і **І. Харыка;** па масавай рабоце—у складзе т. т. **П. Галавача, П. Швэйдэля, А. Александровіча, Крапівы** і **Юдэльсона;** па сацыяльна-бытавых пытаньнях—у складзе т. т. **Іл. Гурскага, Іл. Барашкі, Л. Бэндэ, К. Чорнага, Кульбака, Нёманскага.**

Ухвалена, што пытаньнямі ўкомплектаваньня апарату і сродкамі павінен заняцца прэзыдыум.

Даручана камісіі масавай работы ў самы кароткі тэрмін прадставіць прэзыдыуму плян папулярызацыі і растлумачэньня апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый на пэрыферыі, у філіялах БелАПП, ЛАЧАФ і БАПКП і літаратурных гуртках.

Аргсакратаром арганізацыйнага камітэту абраны т. **Іл. Барашка.**

Новая пазыка--удар па капіталістычных інтэрвэнтах

Шырокай хваляй новага ўздыму і энтузіязму рабочыя, служачыя і адм.-тэхнічны пэрсанал Менскага вагонарамонтнага заводу «Полыя рэвалюцыі» сустрэлі ініцыятыву перадавых заводаў аб выпуску новае пазыкі імя чацьвёртага заключнага году пяцігодкі.

Агульныя цэхавыя сходы ўсяго за воду, горача вітаюць гэту ініцыятыву, цалкам яе падтрымліваюць, далучаючыся да яе.

Старыя пралетары чыгункі ў сваіх выступленьнях разгарнулі яскравы малюнак разбуранае гаспадаркі нашае краіны, пакінуты нам царызмам.

Асабліва характэрна выступленьне старога рабочага заводу, лепшага ўдарніка, маляра тав. Сенькевіча, які расказаў як рос завод пасьля белапольскай акупацыі, як будуецца ўся наша гаспадарка і заклікаў усіх рабочых заводу прасіць урад паскорыць выпуск новай пазыкі.

Цэхавыя сходы вынесьлі наступную пастанову:

— Заслухаўшы інфармацыю аб пат рабаваньні рабочых перадавых прадпрыемстваў БССР перад урадам аб выпуску пазыкі чацьвёртага заключнага году пяцігодкі, мы, рабочыя, інжынэрна - тэхнічны, адміністрацыйны пэрсанал, служачыя вагоннага заводу «Полыя рэвалюцыі» цалкам далучаемся да гэтых патрабаваньняў і просім урад як мага хутчэй здаволіць наша запатрабаваньне, бо мы сваімі рукамі будуем сацыялістычную гаспадарку і ведаем, **што сродкі, якія мы даем у пазыку дзяржаве ідуць на разгортваньне будаўніцтва і палепшаньне матар'яльна-бытавых умоў сваіх працоўных мас і ставіць нашу краіну яшчэ больш незалежнай ад капіталістычных дзяржаў.** Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі мы дамагліся вялізарных посьпехаў у галіне індустрыялізацыі нашай краіны і рэканструкцыі сельскае гаспадаркі. Задачы, што стаяць у чацьвёртым заключным годзе, патрабуюць ад нас яшчэ большага напружаньня энэргіі на пасьпяховае іх выраішэньне.

Мы абавязваемся пасьля выпуску на зыкі ўсамы кароткі час яе рэалізаваць, забясьпечыўшы 100-процантны ахоп падпіскай усіх рабочых ня менш чым на месячны заработак. Падпіскай на пазыку мы яшчэ мацней ударым па капіталістычных інтэрвэнтах, якія ім кнуцца сарваць наша мірнае будаўніцтва, па клясавым ворагу і яго агенты—ворагах бальшавіцкіх тэмпаў правых і «левых» апартуністаў.

Няхай жыве камуністычная партыя—кіраўнік сацбудаўніцтва!

Няхай жыве ленінскі ЦК! Няхай жыве непахісны ленінец тав. Сталін!

Прынятыя на цэхсходах усіх цэхаў заводу 4-VI-1932 г.

Фінбанкаўцы за выпуск Новай пазыкі

Мы, работнікі калектываў Белканторы дзяржбанку і Менскага аддзяленьня, для пасьпяховага завяршэньня пяцігодкі за чатыры гады і баль шавіцкае ўступленьне ў выкананьне намечанай праграмы другой пяцігодкі, хваляючы ініцыятыву чырвонасьцяжнага заводу «Бальшавік», фэк «Акцябр», пралетараў Крычаўскага цэмантнага волату, Танежскай МТС і інш. перадавых заводаў і фабрык БССР і СССР просім саюзны ўрад пасьпяшаць з выпуськам новай пазыкі імя чацьвёртага завяршаючага году пяцігодкі. З свайго боку зварочваемся да ўсіх фінансавабанкаўскіх работнікаў БССР падтрымаць нашу просьбу перад урадам СССР аб паскораньні выпуску новай пазыкі.

Мы ўжо гатовы да 100-процантнай рэалізацыі новай пазыкі

(Па тэлефоне ад наш г. к.)

БАРЫСАЎ. 4 чэрвеня на камбінаце «Камінтэрн» па ўсіх цэхах і зьменах адбыліся пазачарговыя сходы рабочых па абгаварэньні адкрытага ліста рабочых заводу Сталіна аб выпуску новай пазыкі. Рабочы калектыў у колькасьці 1.200 чалавек аднагалосна пастанавіў: далучаючыся да халайніцтва сталінцаў, у сваю чаргу просім саюзны ўрад паскорыць выпуск новай пазыкі. «Мы ўжо гатовы да 100-процантнай рэалізацыі новай пазыкі»,— так аднагалосна заявілі рабочыя камбінату.

Рабочыя макароннай фабрыкі імя Леніна далучыліся да халайніцтва рабочых заводу імя тав. Сталіна аб выпуску новай пазыкі чацьвёртага за ключнага году, і зьвярнуліся з адкрытым лістом да ўсіх рабочых Барысаўшчыны з заклікам аб разгортваньні работы па халайніцтве перад саюзным урадам аб паскарэньні выпуску новай пазыкі.

Мы просім паскорыць выпуск новай пазыкі

Мы рабочыя Вальмянскай рыбгаспадаркі Чэрвенскага раёну, у ліку 280 чалавек абгаварыўшы апошнія пастановы ЦК УсеКП(б) і СНК, а таксама далейшыя задачы чацьвёртага заключнага году пяцігодкі, улічыўшы важнасьць і вялікую патрэбнасьць сродкаў, якія ўзьнімаюць яшчэ на большую ступень рост сацыялістычнага будаўніцтва, просім урад паскорыць выпуск новай пазыкі «4-га завяршэньня году пяцігодкі».

Па даручэньні атульнага сходу рабочых:

Ярашэвіч, Сабалеўскі, Чакатоўскі.

Молатаўцы далучаюцца да перадавых

3-га чэрвеня на дрэваапрацоўчым заводзе імя Молатава (Менск) адбыўся агульна-заводзкі мітынг рабочых, ІТР і служачых заводу па пытаньні аб выпуску новай пазыкі. Удзельнікі мітынгу аднагалосна пастанавілі: падтрымаць ініцыятыву перадавых заводаў, фабрык, саўгасаў і калгасаў БССР і СССР аб выпуску новай масавай пазыкі чацьвёртага заключнага году першай пяцігодкі і ў сваю чаргу просім саюзны ўрад аб паскораньні яе выпуску.

У прынятай рэзалюцыі гаворыцца: выпуск новай пазыкі адыграе вялізарнейшую ролю ня толькі ў завяршэньні першай пяцігодкі, але створыць моцную фінансавую базу для пасьпяховага выкананьня пляну другой пяцігодкі, узьніме творчы энтузіязм усіх працоўных Савецкага саюзу на хутчэйшую рэалізацыю апошніх гістарычных пастаноў партыі і ўраду.

— Мы, рабочыя, ІТР і служачыя заводу імя Молатава, заявляем партыю і ўрад, што пры выпуску новай пазыкі з першых дзён мабілізуем сябе на поўную яе рэалізацыю.

Новыя машыны маскоўскага аўтамабільнага заводу імя тав. СТАЛІНА, якія перададзены ў РСЧА, — на першамайскім парадзе ў Маскве.

Аб правядзеньні праполачнай і ўборачнай кампаній

Пастанова калегіі Наркамзему і праўленьня Калгасцэнтру БССР

Улічваючы недахопы мінулага году ў галіне арганізацыі і правядзеньня ўборачнай і праполачнай кампаній, якія заключаліся галоўным чынам, у невыстарчальным доглядзе за пасевамі, несваячасовай уборцы, невыстарчальнай увазе да захаваньня ўраджаю, асабліва бульбы, у выніку чаго пасьля ўборкі выявіліся значныя страты, якія ў некаторых калгасах выклікалі труднасьці зімой і вясной гэтага году ў справе забясьпечаньня насеньнем і фуражом, і падкрэсьліваючы, што пэнтральнай задачай праполачнай і ўборачнай кампаній 1932 г. выяўляцца рашучае павышэньне ўраджайнасьці і зьніжэньне страт, калегія НКЗ і праўленьне Калгасцэнтру пастанаўляюць:

Паставіць перад усімі райза, калгасаюзамі, МТС, калгасамі і брыгадамі наступныя задачы:

1. Мабілізаваць шырокія масы калгасьнікаў і калгасьніц на барацьбу са стратамі ў сельскай гаспадарцы і на ліквідацыяньне апрамерапрыемстваў.

2. Стварыць моцную кармовую базу шляхам абавязковага і своячасовага правядзеньня 2-х укосаў сенажацяй і поўнай уборкі кармовых культур.

3. Правільна арганізаваць працу і расстаўць рабочую сілу ўнутры брыгады, поўнасьцю скарыстаць на асчове зьдзельшчыны працоўную сілу, пра полачныя і ўборачныя машыны.

4. Райза, калгасаюзам, МТС і праўленьням калгасаў растлумачыць кожнаму брыгадзіру і калгасьніку, што ад ступені і якасьці выкананьня гэтых задач залежыць таварнасьць сацыялістычнай гаспадаркі, велічыня ўраджаю на вучастку брыгады і тым самым велічыня ацэнкі працадня ў брыгадзе і размер даходу кожнага калгасьніка.

У галіне агратэхнікі аховы пасеваў

1. Арганізаваць барацьбу са сьмяцьцевымі травамі шляхам:

а) правядзеньня поліва ільнаніцы, бабовых і гатункоевых пасеваў ад пустазельля;

б) правядзеньня двухразовага поліва ільну і ня менш 3-разовага поліва конопляў і гародаў.

2. Своячасова правесьці мерапрыемствы па барацьбе са шкоднікамі і хваробамі с.-г. расьлін, у прыватнасьці, па садох на плошчы ня менш 5.500 га, гародах—7.500, тэхкультур—7.000 га, кораненлодах — 6.500 га, бульбе — 10.500 га, абавязваўшы АБШ завезьці для гэтай мэты апаратуру і атруту.

3. Правесьці своячасовае баранаваньне і двухразовую абсыпку бульбы.

4. Правесьці ўзорваньне ўсяго чыстага папару, вывазку гэлны, гною, фасфарытнай мукі ў папар да 15 чэрвеня і ня менш двухразовага баранаваньня пасьля ўзорваньня.

5. Адказнасьць за своячасовае правядзеньне агратэхнічных мерапрыемстваў на вытворчым зучастку брыгады ўскласьці на брыгадзіра.

У галіне ўборкі

1. Своячасова распачаць уборку. Уборку траў праводзіць у пачатку квітэньня, збожжавых — у пэрыяд васковай сьпеласьці, цераблёньне ільну—у пэрыяд жоўтай сьпеласьці, уборку бульбы—пры зацьвядзеньні кажуры.

2. Устанавіць наступны працяг і тэрміны сканчэньня ўборкі розных культур: уборку сенажацяй першага ўкосу—за 20 дзён, другога ўкосу—15 дзён, сухадольных і лясных сенажацяй—20, канюшыны на корм першага ўкосу—12, другога ўкосу—15, ільну—15, канапель—15, азімых—10, яравых збожжавых—15, бульбы—20 дзён.

Тэрміны скончэньня ўборкі ўстанавіць наступныя:

Уборка сенажацяй першага ўкосу—ад 5 да 10 ліпеня, другога ўкосу—ад 20 да 25 верасьня, сухадольных і лясных сенажацяй—да 20-VII—паўднёвая зона, да 25-VII—цэнтральная, да 30-VII—паўночная.

Уборка канюшыны першага ўкосу—25—30-VI, другога ўкосу—30-VIII—5-IX, ільну—да 20-VIII—паўднёвая зона, 25-VIII—цэнтральная, 30-VIII—паўночная зона, уборка азімых—10—15-VIII, яравых збожжавых — да 20-VIII—паўднёвая, 25-VIII—цэнтральная, 30-VIII—паўночная зоны; бульбы—да 1—5 кастрычніка.

3. Калгасаюзам, райза, МТС устанавіць сыстэматычную праверку выкананьня гэтых тэрмінаў уборкі.

4. У мэтах найбольш поўнага скарыстаньня с.-г. машын, устанавіць наступную напрузку на ўборачную машыну: для сенажаркі—6 га ў дзень, конных грабель—8 га, на жнэйвяркусамаскідку—5 га, на ільнацерабілку са снопавязальным апаратам—1,2 га ў дзень, на ільнацерабілку без снопавязальнага апарату—1,2 га, на машыну Гільштэйна на абчосе галовак—60 коп, на латарню Эддзі—40 коп., бульбакапалку—1 га, радкоўную сеялку пры сяўбе азімых—4 га ў дзень.

5. Райза, калгасаюзам, дырэктарам МТС і праўленьням калгасаў зараз-жа прыступіць да падрыхтоўкі машын на ўборачную кампанію, забясьпечыўшы іх гарючым, запаснымі часткамі і прымацаваўшы да работы на іх пастаянных людзей. Арганізаваць шырокую міжкалгасную ўзаемадапамогу ўборачнымі і апрацоўчымі машынамі.

6. Уборку ўсіх культур арганізаваць канвэерным спосабам з тым, каб сьледам, за жнівам, цераблёньнем, касьбой або копкай бульбы праводзіць сушку, звозку, скірдаваньне, апрацоўку і хаваньне ўраджаю, не дапускаючы, як праяўла, пакіданьня ўраджаю на полі ў снапох больш 2-3 дзён.

Абавязаць Белсельснаб і Трактарацэнтр завезьці да ўборачнай кампаніі спэцыяльных уборачных машын на 3 млн. руб., у тым ліку па сенажарцы—3,5 тыс. штук на суму 470 тыс. руб., жатак і снопавязалак—2 тыс. штук на 400 тыс. руб., бульбакапалак—2 тыс. штук на 470 тыс. руб.

Арганізацыя працы ў часе праполачна-уборачнай кампаніі

1. Усім праўленьням калгасаў не пазьней 10 чэрвеня скласьці па кожнай брыгадзе рабочы плян праполачна-уборачнай кампаніі, з улікам арганізацыі плянавага адыходніцтва.

2. З прычыны таго, што ў некаторых калгасах брыгады або зусім не арганізаваны, або арганізаваны няправільна (ня вызначаны вучасткі, арганізаваны сэзонныя брыгады замест пастаянных і г. д.) правесьці да пачатку праполачнай кампаніі афармленьне брыгад у пастаянныя на цэлы год, замацаваўшы за брыгадамі с.-г. машыны, інвэнтар, цягавую сілу.

3. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на правільную расстаноўку сіл унутры брыгады. Выходзячы з наяўнасьці рабочай і цягавай сілы, інвэнтара, аб'ёму і тэрміну работ па кожнай культуры, разьбіць брыгады на групы так, каб усе работы праводзіліся бесьперабойна і былі окончаны ва ўстаноўленыя тэрміны.

4. Праўленьням калгасаў ускласьці адказнасьць на брыгадзіраў і дапамагчы апошнім арганізаваць пераключэньне брыгад, брыгадных груп і асобных калгасьнікаў з сяўбы на праполку і ўборку, такім чынам, каб ня было прастояў і каб усе ўдзельнікі брыгады былі поўнасьцю ўцягнуты ў працу.

5. У выпадках немагчымасьці для брыгады, ня гледзячы на ўжчынёньне рабочага дня, сваімі сіламі скончыць тую або іншую працу ва ўстаноўленыя тэрміны, праўленьне калгасу павінна арганізаваць ёй дапамогу з боку іншых брыгад. Адначасова трэба рашуча змагацца з цякучасьцю ў брыгадах, канчаткова ліквідаваць абязьлічку палівых вытворчых вучасткаў.

6. Улік працы і запіс прададзён праводзіць так, каб кожны калгасьнік штодзённа ведаў сваю выпрацоўку па прададзёнах. Арганізаваць вывешваньне сьпісаў выпрацаваных прададзён на відных месцах. Праводзіць штодзённа кароткія нарады ў часе абедзеных перапынкаў, або пасьля скончэньня працы аб ходзе работы ў брыгадзе.

7. Абавязаць усе праўленьні калгасаў і ўсіх брыгадзіраў перад пачаткам праполачных і ўборачных работ яшчэ раз прапрацаваць у брыгадзе нормы выпрацоўкі, устанавіўшы прэмі за лепшае па якасьці і колькасьці выкананьне і перавыкананьне вытворчых заданьняў, адразу пасьля выкананьня тэй або іншай работы па доглядзе і ўборцы.

8. Арганізаваць шырока сацыялістычнае спаборніцтва паміж калгасамі, брыгадамі, групамі і асобнымі калгасьнікамі на больш хуткае выкананьне работы і на лепшыя якасныя паказьнікі, рэгулярна асьвятляючы ў насьценных газэтах, раённым і цэнтральным друку ход выкананьня ўмоў па сацспабор ніцтве, лепшыя прыклады працы і выкрываючы тых, якія плятуцца ў хвасьце.

9. Для ўцягненьня ўсёй рабочай сілы ў работу па праполцы і ўборцы, прапанаваць райзе, калгасаюзам і МТС не пазьней 15 чэрвеня разгарнуць поўнасьцю работу дзіцячых ясьляў, дзіцячых пляцовак, устаноў грамадзкага харчаваньня. Арганізаваць калектыўны падвоз харчоў у поле.

10. У часе праполачнай і ўборачнай кампаній не павінна быць нізоднага працаздольнага члена калгасу, які-б за стаўся нават на адзін дзень без работы.

Стварэньне кармовай базы

1. У мэтах поўнага забясьпечаньня кармамі калгасных таварных фэрм, іншай апрамаджанай жывёлы і жывёлы, якая знаходзіцца ў асабістым карыстаньні калгасьнікаў, абавязаць райза, калгасаюзы, МТС і праўленьні калгасаў зьвярнуць асаблівую ўвагу на правядзеньне мерапрыемстваў па стварэньні кармовай базы.

2. Забясьпечыць поўнасьцю правядзеньне двух укосаў сенажацяй і своячасовую ўборку сеяных траў.

3. Вызначыць плошчу для пакіданьня на насеньне: лубіну, сэрадэлі, вікі палепшанай (аднатыповай) — на 100 проц., бабовых—ня менш 50 проц., вікі звычайнай—ня менш 30 проц., канюшыны чырвонай—ня менш 30 проц. першага ўкосу ў раёнах паўночнай зоны і другога ўкосу ў раёнах цэнтральнай і паўднёвай зоны і ня менш 50 проц. у насеннаводных калгасах. Таксама вызначыць насеньні вучасткі збожжавых, бульбы, гародніны лепшай гатункавай якасьці і здаровых ад пашкоджаньняў і больш каштоўныя па ўраджаі для стварэньня насеннафонду, выходзячы з 100 проц. засыпкі насеннафондаў веснавой сяўбы 1933 г.

4. З прычыны таго, што пэрыяд уборкі сенажаці зьяўляецца найбольш напружаным, упічыльніць у гэты пэрыяд максымальна працоўны дзень і шырока арганізаваць дапамогу паляным брыгадам з боку іншых брыгад (жывёлагадоўчых, будаўнічых і г. д.).

5. Праўленьням калгасаў забясьпечыць выкананьне пляну сілазаваньня, абавязаўшы будаўнічыя брыгады калгасаў да 10 ліпеня поўнасьцю скончыць рамонт старых і пабудову новых сіласных ям, траншэй і вежаў.

6. Праўленьням калгасаў забясьпечыць уборку сіласных культур і сілазаваньне іх у вызначаны тэрмін: да 1 жніўня—15 проц., да 1 верасьня—50 проц. і поўнае скончэньне сілазаваньня не пазьней 1-га лістапада.

Улік і хаваньне ўраджаю

1. У мэтах зьнішчэньня страт пэ перавозцы і хаваньні ўраджаю і для стварэньня магчымасьці праўльнага разьмеркаваньня яго, арганізаваць поўны ўлік ураджаю шляхам пробных абмалотаў і шляхам пільнага нагляду пры скірдаваньні, буртоўцы і звозцы ў закрытыя памяшканьні (сьвірны, клавовы і інш. насенахавальнікі).

2. Улічваючы значныя страты, якія мелі месца ў мінулым годзе пры перавозцы з поля і захаваньні ўраджаю, абавязаць райза, калгасаюзы, МТС і праўленьні калгасаў правесьці да пачатку ўборкі рамонт, ачыстку і дэзынфэкцыю ўсіх окладачных памяшканьняў (гумнаў, сьвірнаў і інш.). Ускласьці ў калгасах адказнасьць за перавозку і хаваньне ўраджаю на кладаўшчыкоў, або спэцыяльна вылучаных людзей і арганізаваць перадачу ім па прыёмачнай ведамасьці ўраджаю на месцы абмалоту.

Безадкладна падрыхтавацца да ўборачнай і праполачнай кампаній

1. Праграму і плян правядзеньня праполачнай і ўборачнай кампаній зацьвердзіць. Даручыць сэктару агратэхнікі і с.-г. кампаніі і плянаваму сэктару давесьці праграму і плян да калгасаў не пазьней 10 чэрвеня.

2. Прапанаваць усім райза, калгасаюзам і МТС давесьці праграмы і пляны ўборачнай і праполачнай кампаній да калгасаў і брыгад, арганізаваўшы шырокую прапрацоўку іх калгасьнікамі.

3. Даручыць райзе, калгасаюзам і МТС зараз-жа пасьля скончэньня сяўбы разгарнуць работу курсаў, курсаў-нарад, правесьці канфэрэнцыі, для падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі актыву для праполачнай і ўборачнай кампаній (брыгадзіраў, групаводаў, трактарыстаў, працаўнікоў на прычэпных машынах, зучоўчыкаў, кладаўчыкоў і інш.).

4. Правесьці перад пачаткам уборачнай кампаніі нарады старшынь калгасаў па пытаньнях разгортваньня і правядзеньня ўборачнай кампаніі.

Больш клясавай пільнасьці

Кулак добра ўяўляе сабе, што толькі штодзённая практычная работа па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў у іх арцельнай форме разьвіцьця, правільная арганізацыя працы на аснове стварэньня пастаянных вытворчых брыгад можа забясьпечыць пасьпяховае правядзеньне праполачнай і ўборачнай кампаній. Кулак будзе імкнуцца зрываць праполку і ўборку, з сярэдзіны разбураць калгасы. Бязьлітасна выкарчоўваючы ўсе спробы клясавага ворага, кожны калгасьнік павінен зьяканаць і перавыканаць як колькасныя, так і асабліва якасныя паказьнікі ў сваёй рабоце і тым самым яшчэ раз нанесьці зьнішчальны ўдар па кулаку і яго прыхільніках.

Народны камісар земляробства БССР **Рачыцкі.**

Старшыня праўленьня Калгасцэнтру **Міцькоў.**

ЗА ГРАНІЦАЙ

„Становішча ў Манчжурыі сур'езнае"

Выступленьне Аракі

ТОКІЕ, 3-VI. У парламанце выступіў вайсковы міністр Аракі і міністр Окада. Спыніўшыся на становішчы ў раёне Шанхаю, Аракі ўказаў, што абарона японскіх рэзыдэнтаў у Шанхаі забясьпечваецца падтрыманьнем морскага дэсанту, жандарскага і кулямётнага атрадаў. Эвакуаванае з Шанхаю японскае войска гатова ў любы момант, у выпадку патрэбы, зьвярнуцца назад.

Закранаючы пытаньне аб становішчы ў паўночнай Манчжурыі, Аракі адзначыў, што дзейнасьць партызанскіх атрадаў за апошнія часы ўзмоцнілася і, што гэта зьвязана з прабываньнем камісіі Лігі нацый. Па думцы Аракі, колькасьць Квапунскай армії недастаткова для падтрыманьня парадку ў Манчжурыі. Аракі лічыць, што становішча ў Манчжурыі па-ранейшаму застаецца сур'ёзным.

Спыняючыся на падзеях 15 мая, Аракі выказаў жаль наконт таго, што юнкеры ўдзельнічалі ў тэрарыстычных актах. Морскі міністр у сваёй прамове катэгарычна асудзіў удзел морскіх афіцэраў у падзеях 15 мая і заявіў, што морскія ўлады прыкладаюць усе намаганьні да спыненьня гэткіх цяжкіх парушэньняў вайсковай дысцыпліны

Заява японскага прэм'ера

НЬЮ-ЁРК. 2 чэрвеня ў інтэрв'ю «Асошэйтэд», японскі прэм'ер Сайто выказаў надзею, што акалічнасьці, якія прымусілі-б Японію пакінуць Лігу нацый ня ўзьнікнуць. Адказваючы на пытаньні карэспандэнта, Сайто сказаў: «японскі ўрад нядаўна заявіў, а затым паўтарыў, што ніякай пагрозы вайны з Савецкім саюзам ня існуе». Далей Сайто заявіў, што «пазыцыя СССР у адносінах да падзей была надзвычайна карэктнай Японскі ўрад спадзяецца, што савецкі ўрад у будучым аднясецца з давер'ем да шчырасьці Японіі, якое дазволіць Савецкаму саюзу спыніць канцэнтрацыю ваенных сіл на Далёкім Усходзе, таму што японскі ўрад лічыць, што «гэтая пасьпяховая канцэнтрацыя зьявілася сапраўднай крыніцай чуткаў, што распаўсюджваюцца ў апошнія часы і ня маюць ніякіх падстаў аб рознагласьці паміж абедзьвюма краінамі».

На пытаньне ці мае намер японскі ўрад заключыць з Савецкім Саюзам пакт аб ненападзе—Сайто ўказаў, што «маецца неблясьпека, што заключэньне пакту аб ненападзе паслабіць адносіны з краінамі, з якімі Японія не заключыла «пакту аб ненападзе». Гэткі факт мог-бы многімі разглядацца як устанаўленьне тых асабліва блізкіх адносін, якія так часта абгаворваліся. Значыцца, да прыняцьця канчаткова пастановы належыць з максымальнай сур'ёзнасьцю разгледзець акалічнасьці, што адносяцца да дадзага пытаньня».

У адказ на пытаньне аб КУ чыгунцы, Сайто заявіў, што «інтарэсы СССР на КУ чыгунцы ні ў якай меры не супярэчыць законным інтарэсам Японіі ў Манчжурыі, таму што ў Манчжурыі прынамсі, праводзіцца палітыка «адкрытых дзьвярэй». Улічваючы гэтае, нельга лічыць пажаданым, каб Японія пасягала на інтарэсы іншых краін у адносінах да КУЧ.

Адказваючы на пытаньні, якія маюць дачыненьне да Манчжурыі, Сайто сказаў: «прызнаньне манчжурскай дзяржавы залежыць ад зьвычайных умоў прызнаньня новых дзяржаў. Адной з гэтых умоў зьяўляецца доказ аб здольнасьці да існаваньня ў якасьці дзяржавы. Японія бязумоўна не жадае анэксаваць Манчжурыю і кантраляваць яе палітыку нелегальнымі сродкамі».

* * *

ТОКІЕ. 1. Квантунскі губарнатар ЯМАОКА, у інтэрв'ю заявіў, што лічыць неабходным давесьці лік японскіх эмігрантаў у Манчжурыі да паўтара мільёнаў чалавек.

Сьледзтва па справе Гаргулова закончваецца

ПАРЫЖ, 2-VI. Агенцтва «Гавас» паведамляе «сьледзтва па справе Гаргулава меркавальна, відаць, закончана. Сёньня ўдзень адбыўся апошні допыт забойцы. У часе допыту судовы сьледчы паведаміў Гаргулаву заключэньне мэдыкаў-псыхіятраў. Гаргулоў заявіў: «Я хачу памерці, але я жадаю, каб зразумелі маю ідэю; якая заключылася ў тым, каб адрадаваць сьвет ад камунізму. У мяне ня было ніякай злобы супроць Думэра, якім я быў захоплены, як вельмі сумленным чалавекам. Калі-б быў другі прэзыдэнт, я-б яго таксама забіў».

Гаргулоў пазнаў факсімільле подпісу яго маткі, надрукаванае ў савецкай газэце. Абарона патрабуе дадатковага расьледзаньня ўтварэньня экспэртызы разумовых здольнасьцяй Гаргулова».

ПАРЫЖ, 3-VI. Агенцтва «Гавас» паведамляе: судовы сьледчы накіраваў патрабаваньне аб дадатковым расьледзаньні на карысьць Гаргулова, які будзе адданы суду ў абвінавачаньні ў забойстве.

Маніфэст ваеннага міністра Германіі

БЭРЛІН. Новы германскі ваенны міністр генэрал Шлейхэр апублікаваў маніфэст.

«Я ўжыву свае сілы на тое—гаворыцца ў маніфэсьце—каб зрабіць рэйхсвэр здольным выканаць сваю задачу—абараняць граніцы Германіі і забясьпечыць яе нацыянальную бясьпеку. Апрача таго, у буду клапаціцца аб умацаваньні ўсіх духоўных і фізычных сіл нашага народу, якія ствараюць неабходную аснову абароны краіны. Я ўпэўнены, што ўнутры ўраіны факт наяўнасьці згрупаванай і надпартыйнай сілы зьяўляецца дастатковым для забясьпечаньня аўтарытэту дзяржавы супроць розных пасяганьняў».

Заява фон-Папена

БЭРЛІН. Новы германскі канцлер фон-Папен прыняў прадстаўнікоў германскага друку і зрабіў ім кароткую заяву, у якой падкрэсьліў, што «справа Брунінга застанецца недатыкальнай» і што новы ўрад будзе працягваць яго справу. Далей Папен асабліва спыніўся на неабходнасьці нацыянальнага аб'яднаньня ўсіх сіл незалежна ад таго, з якога лагеру яны ідуць».

Рабочыя арганізуюць адпор фашызму

БЭРЛІН. 3-VI. Рост фашысцкай небясьпекі выклікае ўсё большае згрупаваньне германскіх рабочых. У паўночна-ўсходняй частцы Бэрліну рабочыя—члены «саюзу рэспубліканскага сьцягу» і антыфашыцкі саюз выбралі супольны камітэт адзінства, задача якога заключаецца ў падрыхтоўцы антыфашысцкага кангрэсу паўночна-ўсходняй часткі Бэрліну ў ліпені, з удзелам сацыял-дэмакратычных рабочых і рабочых, якія далучаюцца да «саюзу рэспубліканскага сьцягу».

Латвійскі друк аб савецка-латвійскім дагаворе

РЫГА, 2-VI. Латвійскія газэты прысьвячаюць артыкулы і заметкі наконт 5-ай гадавіны падпісаньня савецка-латвійскага гандлёвага дагавору. Лідэр сацыял-дэмакратаў Мэндэ